ЛІМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 45 (5150) 12 лістапада 2021 г. ISSN 0024-4686

16+

На варце духоўнасці і культуры
стар. 4

Крывіцкі след Дастаеўскага
стар. 5

Жыццёвыя казкі Коласа
стар. 10

Жанчына, якую кахаў паэт

Часовая экспазіцыя пад назвай «Станкевічанка», што нядаўна адкрылася ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы, — своеасаблівая падзяка стваральніку і першаму дырэктару ўстановы Уладзіславе Францаўне Луцэвіч да яе 130-гадовага юбілею.

Унікальнасць выстаўкі ў тым, што ўсе экспанаты, прадстаўленыя тут — а гэта 189 дакументаў і іншых музейных прадметаў, — арыгінальныя. А самым даўнім з'яўляецца метрычны запіс аб нараджэнні і хрышчэнні Уладзіславы Станкевіч з адзнакай аб вянчанні з Іванам Луцэвічам. З дакумента зразумела, што нарадзілася Уладзіслава ў Вішневе, дзе і была ахрышчана ў касцёле. Бацькамі яе былі беларус Франц Станкевіч і француженка Эмілія Манэ. За шклом вітрын — каштоўныя фотаздымкі з Вішнева, фальварка Каралінова (цяпер там захаваўся толькі падмурак дома, дзе жыла сям'я Станкевічаў). Сцены старога будынка, сям'я на тагачасным «транспарце» — конях, дзе сярод дарослых і маленькая Уладка — гэтыя шчаслівыя імгненні, злоўленыя аб'ектывам фотаапарата, захавалі часцінкі колішняга сямейнага цяпла і ўтульнасці. На іншым здымку Уладзіслава ўжо дзяўчына — магчыма, сямейнікі праводзяць яе працаваць у Вільню ў 1908 годзе. Напамінам пра шчаслівыя гады застаўся здымак 1904 года, дзе юная Уладзіслава — разам са сваёй старэйшай сястрой Марыяй. Захавала стужка і выяву аднаго з першых кавалераў Уладкі — Яна Кунца, трохі старэйшага за яе.

Ёсць сярод выяў і касцёл святых Пятра і Паўла, дзе вянчаліся Янка Купала і Уладзіслава 23 студзеня 1916 года — паэт і яго нарочаная былі тады ў Маскве ў эвакуацыі. Дык што за жонку абраў сабе Купала?..

Скласці рознабаковае меркаванне пра Купаліху (як яе называлі і родныя, і сябры) і дапамогуць матэрыялы, прадстаўленыя ў экспазіцыі.

Працяг на стар. 3 ▸

Уладзіслава Луцэвіч. Смаленск, 1918 г.

«ЛіМ»-акцэнты

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з юбілеем народную артыстку Беларусі Людмілу Лаўрыновіч. «Ваш жыццёвы шлях — прыклад дасягнення вяршынь акцёрскага майстэрства і самаадданага служэння мастацтву, — падкрэсліў Кіраўнік дзяржавы. — Больш за 50 гадоў на сцэне Гомельскага абласнога драматычнага тэатра Вы дорыце ўдзячным паклоннікам радасць і добры настрой». У віншаванні гаворыцца, што высокі прафесіяналізм, цікавы рэпертуар, яркае і самабытнае выкананне разнастайных роляў прынеслі Людміле Лаўрыновіч заслужанае прызнанне і вялікую любоў гледача. Прэзідэнт упэўнены, што яе плённая праца і ў далейшым будзе садзейнічаць захаванню найлепшых традыцый нацыянальнага тэатральнага мастацтва.

Памяць. Часовую экспазіцыю «Руіны стралялі», прымеркаваную да 80-годдзя пачатку антыфашысцкага супраціўлення ў акупаваным Мінску, прапануюць наведвальнікам у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Фотадакументальная выстаўка створана на аснове матэрыялаў музея і Нацыянальнага архіва Беларусі. Праект прысвечаны героям Мінскага падполля: арганізатарам і байцам першых падпольных груп, кіраўнікам і членам падпольнага гарадскога камітэта КП(б)Б, іх баявой і палітычнай дзейнасці. Падчас акупацыі ў Мінску дзейнічала 110 падпольных арганізацый і груп, у якіх змагалася больш за 6 тыс. патрыётаў. Матэрыялы экспазіцыі акцэнтаваны на пачатковым, самым цяжкім, этапе барацьбы мінскіх падпольшчыкаў 1941—1942 гадоў і з'яўляюцца істотным дадаткам да пастаяннай экспазіцыі музея па гэтай тэме.

Юбілей. Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа 21 лістапада адзначыць 95-гадовы юбілей. Коласаўцы выйдуць на вялікую сцэну з прэм'ерай трагікамедыі «Ціль» паводле п'есы Рыгора Горына, паведамілі БелТА ў тэатры. У спектаклі занята амаль уся трупа, а ролю Ціля Уленшпігеля выконвае вядучы майстар сцэны Яўген Бераснеў. Рэжысёр спектакля — мастацкі кіраўнік тэатра Міхаіл Краснабаеў. Пастаноўка насычана яркім гумарам і гераічным пафасам. Створаная па матывах рамана Шарля дэ Кастэра, п'еса Рыгора Горына расказвае пра сярэдневяковага блазна Ціля Уленшпігеля, гісторыя якога ніколі не страціць актуальнасці. Сцэнаграфію да спектакля рыхтуе Наталля Лавіцкая-Ермалова, касцюмы стварае Святлана Макаранка. Музыка Руслана Стаброўскага, харэаграфія Дзіяны Юрчанкі. Пераклаў п'есу і тэксты песень Алесь Замкоўскі.

Прысвячэнне. Памятную дошку народнаму артысту Беларусі Міхасю Дрынеўскаму адкрылі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. З 1975 года Міхась Дрынеўскі быў мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Цітовіча, які пад яго кіраўніцтвам стаў высокапрафесійным калектывам, атрымаў шырокую вядомасць у краіне і за яе межамі. За значны ўклад у развіццё беларускага музычнага мастацтва Міхась Дрынеўскі быў узнагароджаны ордэнам і медалём Францыска Скарыны, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. А яшчэ, як адзначыў дэкан вакальна-харавога факультэта акадэміі музыкі Юрый Караеў, Міхась Паўлавіч 47 гадоў працаваў у сценах акадэміі ў якасці педагога. «Студэнты праз усё жыццё пранясуць тое святло, якое выпраменьваў прафесар сваёй выключна творчай натурай, бліскучым пачуццём гумару і выбітным талентам», — упэўнены Юрый Караеў, словы якога цытуе БелТА.

Форум. Ужо вядомы імёны запрошаных гасцей Мінскага міжнароднага Каляднага форуму — 2021, які пройдзе з 14 да 22 снежня ў Вялікім тэатры Беларусі. У першыя дні форуму запланавана прэм'ера оперы Каміля Сен-Санса «Самсон і Даліла». У пастаноўцы Аксаны Волкавай партыю Самсона выканае саліст «Гелікон-оперы», запрошаны артыст Марыінскага, Міхайлаўскага і Вялікага тэатраў Расіі тэнар Іван Гынгазаў. На 17 снежня запланаваны сольны канцэрт Кацярыны Семянчук, прымы Марыінскага тэатра, якая нарадзілася ў Мінску. У гэты ж вечар выступіць саліст таго ж тэатра Магерам Гусейнаў. Дырыжыраваць будзе музычны кіраўнік азербайджанскага тэатра оперы і балета Эйюб Куліеў. 18 снежня ў оперы Шарля Гуно «Фаўст» ролю Валянціна выканае беларус, сусветна вядомы барытон Уладзіслаў Сулімскі з Марыінскага тэатра. У заключны дзень адбудзецца гала-канцэрт, у якім прымуць удзел Кацярына Семянчук, Магерам Гусейнаў, Уладзіслаў Сулімскі, а таксама салістка маскоўскага Вялікага тэатра Венера Гімадзіева (сапрана) і запрошаны артыст Вялікага тэатра Расіі Гадэрдзі Джанелідзэ (бас). За дырыжорскім пультам будзе Джанлука Марчыяна, мастацкі кіраўнік фестываляў «Аль-Бустан» у Бейруце і *Suono del Golfo* ў Лерычы, распавялі арганізатары форуму.

Рэгіёны. У аграгарадку Моладава Іванаўскага раёна (Брэсцкая вобласць) рэканструююць капліцу роду Скірмунтаў. Капліцу ў форме ратонды пабудавалі ў 1905—1908 гадах па праекце віленскага архітэктара Тадэвуша Раствароўскага. Гэта круглая капліца ў стылі неакласіцызму — адзінае ўцалелае збудаванне ў былой сядзібе Скірмунтаў. Яе рэстаўрацыяй заняліся ў 2017 годзе. За гэты час удалося аднавіць купал з крыжам. Цяпер рэстаўратары працуюць з карнізам. Па меры паступлення фінансаў работы будуць працягвацца. Мясцовыя ўлады маюць на мэце абнавіць фасад будынка, потым, калі дазволяць магчымасці, правесці работы ўнутры. На рэстаўрацыю ратонды з раённага бюджэту накіравалі больш за 90 тыс. рублёў. Яшчэ 6 тыс. — гэта сродкі, зароблены на рэспубліканскім суботніку.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

на тэму дня

За непарушнае братэрства

Заява Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы

Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы падтрымлівае рашэнні Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, разглядае іх як новы важны крок у паслядоўным руху ў імя ўпэўненай будучыні Беларусі і Расіі.

Створаны больш за дзесяць гадоў таму пры падтрымцы кіраўнікоў дзвюх дзяржаў Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна, вядомых дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, духавенства дзвюх краін, Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы стаў значнай творчай сілай, накіраванай на захаванне духоўна-маральных каштоўнасцей, выхаванне патрыятызму, што ляжаць у аснове агульнага гістарычнага мінулага і культурнай спадчыны нашых народаў. У складзе нашай творчай каманды, якая пастаянна папаўняецца, — найлепшыя літаратары Беларусі і Расіі.

Вынікам супрацоўніцтва стаў выпуск сумесных кніг і часопісаў, правядзенне круглых сталоў па самых актуальных тэмах сучаснасці, выставак, літаратурных конкурсаў з удзелам моладзі, рэгулярны абмен дэлегацыямі. Наладжана перакладчыцкая дзейнасць. Пісьменнікі абедзвюх краін выступаюць у абарону міру, за ўмацаванне дзяржаўнасці, асуджаюць спробы фальсіфікацыі гісторыі, рэабілітацыі фашызму. Слова пісьменніка служыць пазітыўнаму развіццю Саюзнай дзяржавы.

Прыняты Вышэйшым Дзяржаўным Саветам Саюзнай дзяржавы Дэкрэт «Аб асноўных напрамках рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады» стане практычнай асновай для паглыблення інтэграцыі. Гэты важны гістарычны дакумент накіраваны на эканамічнае, палітычнае і ваеннае супрацоўніцтва, вырашэнне сацыяльных пытанняў па паляпшэнні ўзроўню жыцця грамадзян дзвюх краін, павышэнні іх матэрыяльнага дабрабыту. Прыярытэтны напрамак у дакументе — умацаванне бяспекі Саюзнай дзяржавы.

Новыя падыходы да гуманітарнага супрацоўніцтва дазволяць больш надзейна ўмацаваць падмурак нашага агульнага дома. Пісьменнікі глыбока разумеюць сваю ролю ў выхаванні высокаманальнай асобы, адказнай за сяброўства і непарушны саюз двух брацкіх народаў.

Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, з'яўляючыся адзінай творчай арганізацый на прасторы дзвюх дзяржаў, якая пастаянна падтрымлівае саюзнае будаўніцтва, заклікае дзеячаў іншых творчых саюзаў падтрымаць прыклад літаратараў. Нам важна аб'яднаць і актывізаваць намаганні з тым, каб развіццё Саюзнай дзяржавы стала яшчэ больш стваральным у імя нашай агульнай будучыні.

Мікалай ЧАРГІНЕЦ (Мінск)
Мікалай ІВАНОЎ (Масква),
сустаршыні Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

З новым конкурсам

Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі абвяшчае другі сезон рэспубліканскага гумарыстычнага конкурсу «Папяровы бусел».

Творчае спаборніцтва праводзіцца з 20 лістапада да 10 студзеня. Удзельнікамі могуць быць як прафесійныя літаратары, так і пачаткоўцы, не маладзейшыя за 18 гадоў. Конкурс праводзіцца на дзвюх дзяржаўных мовах.

Прымаюцца творы, якія раней нідзе не друкаваліся, для ўдзелу ў намінацыях «Проза» (малыя формы) і «Паэзія». Работы неабходна даслаць на электронную пошту *tatiana.demidovich@gmail.com.* У лісце ўказаць кароткую біяграфію аўтара, намінацыю, дату стварэння твора, кантакты.

Акрамя лаўрэатаў, у кожнай намінацыі будзе вызначаны абсалютны пераможца, уладальнік Гран-пры, які атрымае ў якасці ўзнагароды памятную статуэтку і грамату.

Найлепшы конкурсны твор будзе надрукаваны ў пятым нумары альманаха «Берасцейская скарбніца».

Арганізатары чакаюць яркіх, самабытных твораў з тонкім добрым гумарам, арыгінальнымі сюжэтамі і цікавымі героямі. Каб павысіць узровень непрадузятасці ацэньвання, работы будуць раглядацца ананімна.

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ

Дзеля будучыні

Днямі ў СШ № 137 і СШ № 70 г. Мінска адбыліся творчыя сустрэчы старшыні Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхася Пазнякова з вучнямі старшых класаў і настаўнікамі.

Па просьбе педагогаў імпрэзу арганізавала дзіцячая бібліятэка № 10, якая знаходзіцца непадалёк ад гэтых навучальных устаноў.

Мерапрыемствы ладзяцца ў межах праграмы «Школа актыўнага грамадзяніна», прымеркаванай да Года народнага адзінства. Пісьменнік расказаў аб рабоце Саюза пісьменнікаў Беларусі, сучасным літаратурным працэсе, пазнаёміў з дзейнасцю сталічнага аддзялення СПБ. Спыніўся на рабоце з юнымі літаратарамі і аматарамі мастацкага слова. Прачытаў свае ранейшыя і новыя патрыятычныя вершы, адказаў на шматлікія пытанні.

Удзельнікам імпрэзы паказалі дакументальную стужку кінастудыі «Беларусьфільм» «Міхась Пазнякоў. Слова паэта», створаную па заказе Міністэрства культуры Беларусі. Вырашана, што падобныя сустрэчы з майстрамі мастацкага слова стануць пастаяннымі.

Павел КУЗЬМІЧ

прэзентацыі

Падмурак для найлепшага

Унікальнае выданне — альбом-каталог «Іканапіс і алтарны жывапіс Беларусі XVI — пачатку XIX ст.» — прэзентавалі ў Нацыянальным мастацкім музеі. У кнізе сабраны рэпрадукцыі праваслаўных і каталіцкіх ікон, а таксама ўніяцкага перыяду, які на беларускіх землях доўжыўся больш за два стагоддзі. Альбом падрыхтаваны навуковымі супрацоўнікамі музея і мастацтвазнаўцамі.

Творы даюць магчымасць пазнаёміцца з унікальнымі мастацкімі каштоўнасцямі Беларусі XVI — XIX стагоддзяў, атрымаць уяўленне аб самабытнасці айчыннай іканапіснай школы, арыентаванай на еўрапейскае мастацтва алтарнага жывапісу. Матэрыялы для кнігі, якая дэманструе значны ўклад беларусаў у сусветную скарбніцу культуры, былі падрыхтаваны яшчэ ў 2016 годзе, калі беларускія іконы адправіліся на выстаўку ў Ватыкан і выклікалі там фурор.

— Напэўна, добра, што кніга не выйшла ў 2016-м, — прызнаецца куратар праекта загадчыца аддзела старажытнабеларускага мастацтва Алена Карпенка. — За гэты час з'явілася мноства новых атрыбуцый, удакладненняў тапаграфіі некаторых ікон, і ў параўнанні з папярэднімі публікацыямі беларускага іканапісу і алтарнага жывапісу тут ёсць некалькі адкрыццяў. Мы імкнуліся падабраць прадметы, якія не так часта публікаваліся. Упершыню цэлы том, дзе апублікавана 114 ікон і твораў алтарнага жывапісу, прысвечаны толькі калекцыі нашага музея.



Уладзімір Пракапцоў.

«Іканапіс і алтарны жывапіс Беларусі XVI — пачатку XIX ст.» адкрывае фундаментальны навукова-адукацыйны праект — серыю «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь», у якой спецыялістам і аматарам прадставяць найлепшыя творы мастацтва са збору музея. Як адзначыў генеральны дырэктар НММ Уладзімір Пракапцоў, усяго запланавана 12 тамоў:

— Наступны том будзе прысвечаны народнаму мастацтву Беларусі, потым падрыхтуем двухтомнік аб сучасным беларускім мастацтве XX—XXI стагоддзяў. Гэта доўгатэрміновы праект, які плануем рэалізаваць цягам 5—6 гадоў, выпускаючы за год па два альбомы. Праца няпростая: музей — не навукова-даследчы інстытут, і нашы мастацтвазнаўцы займаюцца не толькі напісаннем навуковых артыкулаў. Тым не менш яны ўжо «зараджаныя» на наступныя тамы, на тое, каб паказаць калекцыі ў фундаментальных выданнях.

Тэкст першага ў серыі альбома-каталога «Іканапіс і алтарны жывапіс Беларусі XVI — пачатку XIX ст.» друкуецца на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай. Тыраж выдання складае 700 экзэмпляраў.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Жанчына, якую кахаў паэт

Крыніцай для яе стварэння сталі шматлікія аўтабіяграфіі Уладзіславы Францаўны, якія яна пісала з розных нагод, напрыклад, калі ўладкоўвалася на тую ці іншую працу. Калі прааналізаваць іх розныя варыянты, а ў кожным утрымлівалася пэўная адметнасць, цікавы факт, то можна зразумець, што ў 14 гадоў Уладзіслава едзе ў Варшаву, абраўшы, па прыкладзе маці, прафесію педагога. Гэта былі двухгадовыя курсы Стэфаніі Марцішэўскай, якія прыраўноўваліся да вышэйшай адукацыі — іх Уладзіслава завяршае ў 1908 годзе і, маючы дыплом, прыязджае ў Вільню і пачынае працаваць у дзіцячых прытулках. Так, на фота 1915 года Станкевічанка — ужо загадчыца прытулка сярод сваіх гадаванцаў.

У 1920-х гадах Уладзіслава Францаўна працавала ў так званым «Дзіцячым ачагу № 8», які размяшчаўся непадалёк ад дома, дзе жыла сям'я Луцэвічаў — на суседняй, тады Садова-Узбярэжнай, вуліцы. Некалькі здымкаў Купаліхі з дзеткамі і калегамі сведчаць пра той час, як і кнігі з фондаў музея, што напісала для дзяцей, — гэта былі зборнікі вершыкаў, прыказак, музычных твораў. У яе пыталіся: «А дзе вы бераце столькі твораў?» Яна ж адказвала: маўляў, увечары сядаем, Янка словы падбірае, а сама — за кампазітара.

— Дарэчы, набыла новы фармат у межах выстаўкі акцыя «Чытаем Купалу разам», — распавядае падчас экскурсіі загадчык аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы Марыя Барткова. — Мы пастараліся ўвасобіць своеасаблівы паэтычны дыялог: на адмысловых картках з выявай Янкі Купалы набраны тры вершы, што класік прысвяціў Станкевічанцы. Яны былі апублікаваны на старонках «Нашай Нівы». Такая ж картка зроблена і з выявай Станкевічанкі разам з Купалам і яе вершам, які перагукаецца з Купалавымі, адрасаванымі ёй.

Нагадаем, што акцыя «Чытаем Купалу разам» распачалася ў 2012 годзе: у самых розных аўдыторыях класік гучыць на мове арыгінала альбо яшчэ і на мове краіны, дзе праходзіць пэўнае мерапрыемства.

Аздобай выстаўкі з'яўляецца пісьмовы стол, які ад самага пачатку ў музеі быў дырэктарскім, пад шклом на стальніцы — некаторыя матэрыялы, што збірала Уладзіслава Францаўна: блакнот з яе запісамі пра пастаноўку «Паўлінкі» ў Радашковічах у 1913 годзе, «Наша Ніва» з публікацыяй верша Купалы і дзве кнігі Поўнага збору твораў. Белая ружа нагадвае пра тое, што паэт вырошчваў гэтыя кветкі на сваім падворку і дарыў гасцям.

Мастацкімі акцэнтамі часовай экспазіцыі сталі скульптура Льва Гумілеўскага, названая радком з верша Купалы: «Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея», а таксама два жывапісныя партрэты, створаныя Пётрам Сергіевічам яшчэ пры жыцці Уладзіславы Францаўны. Работы гэтыя перадаюць душэўнае харство жанчыны, якую кахаў адзін з самых глыбокіх беларускіх лірыкаў.

Пасля смерці творцы Купаліха пачала па крупінках збіраць спадчыну, памяць пра яго, мемарыялізаваць мясціны, звязаныя з імем паэта. Значная частка матэрыялаў выстаўкі прадстаўляе Уладзіславу Францаўну як першага дырэктара музея. Асноўная калекцыя ўстановы — плён яе працы.

Што да кранальнай назвы выстаўкі — «Станкевічанка» — на яе, як распавядала Марыя Барткова, натхніла візітоўка маладой Уладзіславы. Візітоўка гэтая, зробленая больш ад ста гадоў таму, таксама ў адной з музейных вітрын: літары прозвішча надрукаваны вытанчаным друкарскім шрыфтам на лацініцы.

Некаторыя дакументы экспануюцца на выстаўцы ўпершыню. Гэта асабовыя справы Уладзіславы Францаўны і першых супрацоўнікаў музея: педагога і літаратуразнаўцы Алесі Александровіч і паэта Валянціна Таўлая. Іх перадаў Цэнтральны навуковы архіў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ёсць ліст да сяброўкі дзяцінства Канстанцыі Буйло, дзе распавядаецца аб тым, што ў 1951 годзе ў Купаліхі былі гарачыя дзянёчкі перад адкрыццём музея (гэта была першая экспазіцыя па другім адрасе на вуліцы Энгельса — з яе захаваліся некаторыя фотаздымкі). З іншых адметных прадметаў у экспазіцыі — асабістыя рэчы Станкевічанкі, укладзены ёю альбом біяграфічных матэрыялаў «Янка Купала», падарункі ад сяброў і знаёмых да яе юбілею.

Выстаўка чакае наведвальнікаў да 25 студзеня. А прыходзіць у музей лепш

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Янка Купала і Уладзіслава Луцэвіч. Полацк. 1916 г.

сем'ямі, з малымі дзецьмі. Нягледзячы на тое, што часовая экспазіцыя — дакументальна-мастацкая, малым таксама будзе цікава: інтэрактыў, які на ёй прадстаўлены (своеасаблівая разыначка між музейных вітрын), яшчэ ў XIX стагоддзі рэкамендаваў для ранняга навучання выхаванцаў метадыст Фрыдрых Аўгуст Фробель: гэта гульня з падвешанымі шарыкамі колераў вясёлкі і белага. Ён раіў бацькам рабіць рознакаляровыя шары самастойна, каб, гуляючы з імі, дзеці вывучалі прастору вакол сябе, засвойвалі напрамкі ўлева, управа, наперад, назад, па коле. Пэўны час сістэма выхавання Фробеля была надзвычай моднай: усе прагрэсіўныя педагогі імкнуліся выкарыстоўваць яе ў рабоце з дзеткамі. Карысталася ёю і Уладзіслава Францаўна, «дзіцячая садоўніца», як яе празвалі, — яна арганізоўвала прытулкі для дзетак і беларускія школкі ў Вільні, у эвакуацыі ў Маскве, а ў 1920-я — узорныя дашкольныя ўстановы ў Мінску.

Уладзіслава Францаўна з'яўлялася яркай постаццю ў беларускім культурным жыцці першай паловы XX стагоддзя, удзельнічала ў Віленскім беларускім музычна-драматычным гуртку. Але найперш знакаміта яна тым, што была жонкай Янкі Купалы.

Таша ШПАКОЎСКАЯ
Фота з фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы

праекты

Камісар Мегрэ ў Доме радыё

Першы ў Беларусі радыёсерыял прагучыць у эфіры Першага нацыянальнага канала да 96-й гадавіны Беларускага радыё. Асновай 14-серыйнай аўдыяпастаноўкі стала аповесць класіка дэтэктыўнага жанру французскага пісьменніка Жоржа Сімянона «Мегрэ і чалавек на лаўцы» ў перакладзе на беларускую мову Алеся Асташонка.

Слухаць прэм'еру можна штодня з 15 да 28 лістапада ў ранішнім эфіры ў 10.10 і ў вячэрнім эфіры ў 20.20, а таксама на сайце *radio1.by*.

Як заўважаюць стваральнікі, аповесць адлюстроўвае крызіс сямейных каштоўнасцей у пасляваеннай Францыі. На прыкладзе лёсу простага чалавека аўтар падкрэслівае важнасць захавання маральных прынцыпаў паводзін у грамадстве. Год напісання твора — 1953. Магчыма, усе гэтыя складнікі і зацікавілі пастановачную групу, якой у пачатку года давялося выбіраць твор з мноства класічных.

Заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Андрэй Душачкін і Аляксандр Шароў, артыст Ігар Сідорчык падчас запісу радыёспектакля.

Аўтарам радыёп'есы стаў пісьменнік Уладзімір Сцяпан, рэжысёрам пастаноўкі — Алег Вінярскі, гукарэжысёрам — Валерый Бяляеў. Рэдактарам і кіраўніком праекта выступіла Галіна Шаблінская. Падчас аўдыяпастаноўкі гучыць музыка кампазітара Дзмітрыя Далгалёва.

— Жорж Сімянон змог выказаць у сваёй творчасці боль за чалавека, які ён пранёс праз усё жыццё, — зазначыў Алег Вінярскі. — Мне хацелася закласці ў спектакль, у зусім новы твор, ідэю спачування. Да таго ж для нас гэта была магчымасць адлюстраваць праз усіх персанажаў жыццё пасляваеннага Парыжа — горада, нам зусім не вядомага.

Рэжысёр адзначыў, што для яго было важна абазначыць у радыёпастаноўцы персанажа Луі Турэ, паказаць яго забойства, а таксама праз успаміны герояў перадаць вобраз і лёс.

Галоўныя ролі выканалі заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Аляксандр Гарцуеў (аўтар), артыст Ігар Сідорчык (Мегрэ), народны артыст СССР Генадзь Аўсяннікаў (стары бухгалтар), заслужаныя артысты Беларусі Андрэй Душачкін і Аляксандр Шароў (паліцэйскія), заслужаная артыстка Беларусі Аксана Лясная (мадам Турэ), заслужаная артыстка Беларусі Ганна Маланкіна (Антуанета Машэр), артыст Аляксандр Вергуноў (акрабат Шрамэк). У пастаноўцы занята больш як 20 акцёраў, а таксама 10 артыстаў хору.

— Радыёспектакль вельмі падобны да музычнага твора, — лічыць Андрэй Душачкін. — Кожны акцёр уяўляе сабой ноту, якая, натуральна, можа гучаць па-рознаму. Чым ярчэйшы і цікавейшы той ці іншы акорд, тым больш займальны атрымліваецца спектакль. Прыўнесці сваю ноту ў агульную оперу было, як заўсёды, прыемна. Што тычыцца радыёсерыяла, то гэта вельмі зручная форма ўспрымання класічнага твора. У наш час, на мой погляд, такі фармат прывабіць большую колькасць слухачоў.

Дарэчы, пасля прэм'еры будзе створаны поўнаметражны спектакль з пяці частак. Такім чынам, у фондзе Беларускага радыё «Мегрэ і чалавек на лаўцы» Жоржа Сімянона будзе існаваць у двух паўнацэнных варыянтах.

Яўгенія ШЫЦЬКА
Фота Галіны ШАБЛІНСКАЙ

«ЛіМ»-люстэрка

Вечар беларускай культуры прайшоў у Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Швейцарыі, інфармуе «СБ. Беларусь сегодня». «Мерапрыемства сабрала каля 50 чалавек, уключаючы кіраўнікоў і супрацоўнікаў замежустаноў Рэспублікі Беларусь у Берне і Жэневе, пасла Расіі ў Швейцарыі Сяргея Гармоніна, ганаровых консулаў Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікоў федэральных органаў заканадаўчай і выканаўчай улады, Асацыяцыі дружбы "Швейцарыя — Беларусь", установ адукацыі, СМІ, дыпламатычнага корпуса», — расказалі ў пасольстве. У рамках сустрэчы прайшоў канцэрт твораў беларускіх кампазітараў розных эпох у выкананні музыкантаў-выхадцаў з Беларусі на віяланчэлі і фартэпіяна. Да 130-годдзя класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча прысутныя разам выканалі песню на яго верш «Зорка Венера».

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры прэзентавалі перасоўную выстаўку «"Дзякуючы боскаму Пушкіну". Як ствараўся раман "Танна Карэніна"». Паводле БелТА, гэта сумесны праект з Дзяржаўным музеем Л. М. Талстога (Масква). Госці экспазіцыі могуць убачыць арыгінальныя прыжыццёвыя выданні, пераклады вядомых твораў пісьменніка на беларускую мову, копіі ілюстрацый да рамана, а таксама кадры розных экранізацый. Пры падрыхтоўцы спецыялісты вывучылі ўсё, што звязана з раманам класіка сусветнай літаратуры: пачынаючы з першага імпульсу, які Леў Талстой атрымаў ад Аляксандра Пушкіна, і заканчваючы канчатковымі праўкамі тэксту перад друкам. У адкрыцці экспазіцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, вучоныя, акцёры і работнікі музея.

Нацыянальная літаратурная прэмія «Большая книга» і выдавецкая платформа «ЛітРэс» адкрываюць бясплатны доступ да тэкстаў фіналістаў прэміі, пераможцы якой будуць аб'яўлены ў канцы года, паведамляецца на сайце «ЛітРэс». Ахвотныя маюць магчымасць пазнаёміцца з творамі да 30 лістапада, атрымаўшы промакод на старонцы галасавання на сайце кніжнага рэкамендацыйнага сэрвісу *LiveLib*. У рамках літаратурнага конкурсу паралельна з ацэнкай твораў прафесійным журы праходзіць галасаванне чытачоў, якія могуць аддаць свой голас за адну ці адразу некалькі кніг. Народнае галасаванне вызначыць тры найлепшыя творы года. Сёлета ў спіс фіналістаў увайшлі трынаццаць твораў ад розных аўтараў, у іх ліку — Марына Сцяпнова («Сад»), Яўген Вадалазкін («Апраўданне вострава») і Аляксей Палярынаў («Рыф»).

На *YouTube*-канале тэлеканала *Showtime* змясцілі трэйлер дакументальнага фільма «*The Real Charlie Chaplin*» («Сапраўдны Чарлі Чаплін») аб жыцці і кар'еры зоркі нямога кіно. Стужку стварылі Пітэр Мідлтан і Джэймс Спіні, якія раней знялі «Нататкі аб слепаце» (2016). У фільм увайшлі архіўныя кадры з хатняга архіва акцёра, у тым ліку запісы, якія раней не дэманстраваліся, урыўкі з фільмаў з удзелам знакамітага коміка і закулісся. У карціне расказваюць, як акцёр вырваўся з трушчоб віктарыянскага Лондана і стаў галівудскай суперзоркай, а таксама спрабуюць адказаць на пытанне, кім быў сапраўдны Чарлі Чаплін.

Журы Букераўскай прэміі — 2021 прысудзіла прэмію гэтага года паўднёваафрыканскаму пісьменніку Дэйману Галгуту за раман «Абяцанне». Аўтар ужо тройчы быў намінаваны на прэмію. Яго раман «Добры доктар» трапіў у шорт-ліст у 2003 годзе, а «У дзіўным пакоі» — у 2010-м, гаворыцца ў матэрыяле РІА «Новости». Крытыкі адзначаюць не толькі цудоўны стыль і добра расказаную гісторыю, але і гумар аўтара. «Абяцанне» і творы пяці іншых намінантаў былі выбраны са 158 кніг, апублікаваных у Вялікабрытаніі і Ірландыі з 1 кастрычніка 2020 года да 30 верасня 2021 года. Пераможца прэміі атрымаў 50 тысяч фунтаў стэрлінгаў.

Рэжысёр Квенцін Таранціна выставіць на аўкцыён сем выразаных сцэн з фільма «Крымінальнае чытво» (1994), у якім ён выступіў рэжысёрам і сцэнарыстам. На продаж таксама пойдзе рукапісны сцэнарый і ўласныя аўдыякаментарыі стваральніка карціны, перадае «ИТАР-ТАСС». «Сакрэтная сетка і сакрэтныя *NFT*-токены адкрываюць зусім новы свет, які аб'ядноўвае дзеячаў мастацтва і прыхільнікаў, і я вельмі рады быць яго часткай», — адзначыў рэжысёр. Падкрэсліваецца, што прадстаўленыя фрагменты фільма змогуць убачыць толькі тыя, хто набыў іх на аўкцыёне.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Адным жыццём з народам

Гомельскае абласное аддзяленне ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» — адно з самых актыўных ва ўсіх кірунках дзейнасці ў пісьменніцкай сям'і краіны. Менавіта гэтай творчай суполкай і яе ініцыятыўным і нястомным лідарам на Гомельшчыне закладзена шмат каштоўных традыцый па папулярызацыі кнігі і чытання, беларускай культуры, ушаноўваецца памяць пісьменнікаў-землякоў. Пра апошнія пяць гадоў, сённяшні і заўтрашні дзень гутарым з кіраўніком пісьменніцкай арганізацыі, вядомым беларускім празаікам і публіцыстам Уладзімірам Гаўрыловічам.

— Уладзімір Мікалаевіч, толькі што вам прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь». Шчыра віншуем з такой высокай дзяржаўнай узнагародай! Што адчуваеце ў гэты знакавы момант у жыцці?

— Хіба толькі адно: мабыць, нешта сур'ёзнае, важнае ўжо зроблена табой за паўтара дзясятка гадоў як кіраўніком пісьменніцкай арганізацыі, і як літаратарам больш чым за 35 гадоў творчай дзейнасці. Ёсць спадзяванне, што напісаныя творы пакінулі добры след у душах чытачоў. Але яшчэ шмат што трэба зрабіць дзеля роднай Беларусі. Таму дзяржаўная адзнака ў нейкай ступені — аванс на будучыню, каб працаваць не менш самааддана, творча і сумленна.

— III з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі паставіў перад літаратарамі краіны шэраг творчых задач. Наколькі яны былі рэалізаваны абласным аддзяленнем?

— Скажу шчыра: мне як кіраўніку аддзялення з першага дня яго заснавання не сорамна за зробленае. Ні ад часу стварэння арганізацыі, ні за апошнія гады. Бо ўсё было накіравана на тое, каб запаволіць спад нашай духоўнасці, культуры, адукаванасці, выхаванасці. І гэтую, бадай, асноўную задачу, пастаўленую перад творцамі з'ездам, на сваім узроўні выконвалі і выконваюць сумленна, шчыра, адказна і арганізацыя, і пісьменнікі вобласці. Нават пандэмія не стала перашкодай для работы, напрыклад, па папулярызацыі кнігі і чытання. Мабыць, невыпадкова наша аддзяленне за пяць гадоў было ўзнагароджана залатым медалём М. Шолахава (Саюз пісьменнікаў Расіі, 2020 год), 35 ганаровымі граматамі Саюза пісьменнікаў Расіі, Саюза пісьменнікаў Украіны, Міжнароднага саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтваў і іншых структур.

Так, задача пісьменніка заключаецца найперш у стварэнні высокамастацкіх твораў, і ў гэтым плане гамяльчанам ёсць кім і чым ганарыцца: за пяць гадоў з-пад пяра выйшла звыш 260 кніг. Плённа шчыруюць на творчай ніве драматург Васіль Ткачоў, паэты Ізяслаў Катляроў і Соф'я Шах, Міхась Болсун, Ніна Шклярава, Тамара Кручэнка, Лілія Вялічка, Лідзія Долбікава, Святаслаў Крупенька, Галіна Рагавая, Алег Ананнеў, Іван Бісеў, Надзея Дзмітрыева, празаікі Міхась Сліва і Валянціна Кадзетава-Арэстава, дзіцячыя аўтары Яўген Калашнікаў, Вера Квяткоўская, Людміла Яськова, Іна Зарэцкая, перакладчыца Вольга Раўчанка і многія іншыя.

Увогуле, майстры слова рэгіёна (сёння ў нас 65 аўтараў; за 5 гадоў у СПБ прынята 13 пісьменнікаў-гамяльчан, у тым ліку маладыя таленты Ала Бялькова, Іна Зарэцкая, Вольга Астапенка і інш.) дасягнулі значных поспехаў у творчай і грамадскай дзейнасці, атрымалі звыш 230 творчых узнагарод (медалі, ганаровыя граматы дзяржаўных, грамадскіх структур, Беларускай праваслаўнай царквы), многія сталі лаўрэатамі абласных, рэспубліканскіх і вядомых міжнародных творчых конкурсаў. Зразумела, гэтыя адзнакі сведчаць пра многае.

Нягледзячы на пандэмію, праводзяцца прэзентацыі новых кніг, як ужывую, так і анлайн. Чытачы наведваюць творчыя сустрэчы, удзельнічаюць у абмеркаванні кніг. Савет аддзялення СПБ са свайго боку імкнецца стымуляваць самых актыўных творцаў. Напрыклад, трое аўтараў па выніках працы за мінулы год па рэйтынгу пісьменніцкай арганізацыі прызнаны пісьменнікамі года. Гэта Ізяслаў Катляроў, які выдаў 6 кніг паэзіі і прозы, Міхась Сліва — вядомы празаік, літаратуразнаўца, перакладчык і крытык выдаў 5 кніг, 6 кніг перакладаў паэзіі з замежных моў на рахунку Вольгі Раўчанкі. А па выніках 2021-га аддзяленнем выдадзены зборнік прозы і паэзіі лаўрэатаў новай прэміі «Вернасць Слову» Яўгена Калашнікава, Веры Квяткоўскай, Людмілы Яськовай…

Першыя лаўрэаты літаратурнай прэміі «Палескія росы».

— Вядома, што ваша творчая суполка працягвае шматгранную работу па ўвекавечванні як класікаў беларускай літаратуры — выхадцаў з Гомельшчыны, так і таленавітых пісьменнікаў рэгіёна...

— Так. Па нашай ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле пісьменніцкай грамады крыху раней былі створаны мемарыяльны музей пісьменніка-земляка Міколы Гамолкі ў Жыткавічах. Канцэптуальна напаўненне атрымаў новы музей літаратуры Гомельшчыны ў абласной бібліятэцы. Намаганнямі пісьменніцкай арганізацыі ўвекавечана памяць Івана Сяркова — адкрыта мемарыяльная дошка ў аграгарадку Пакалюбічы Гомельскага раёна. А тры гады таму мы аддалі даніну павагі знакаваму паэту Анатолю Грачанікаву: за кошт сабраных пісьменнікамі сродкаў адкрыта мемарыяльная дошка ў г. Гомелі на доме, дзе ў маладыя гады жыў і працаваў таленавіты творца. Сёлета, дарэчы, разам з пісьменнікамі Растоўшчыны мы плённа папрацавалі над стварэннем літаратурна-этнаграфічнага пакоя Івана Мележа ў Пятрушынскім аддзеле цэнтральнай міжпасялковай бібліятэкі імя І. П. Мележа Няклінаўскага раёна (імя народнага пісьменніка Беларусі па нашай ініцыятыве ўстанове прысвоена чатыры гады таму). Мы ўрачыста адкрылі пакой у дзень 100-годдзя палескага творцы. А ў верасні намаганнямі пісьменніцкай арганізацыі, пры падтрымцы ААТ «Палесдрук», адкрыты памятны знак да 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны і 80-годдзя выхаду першага нумара агітплаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», у адкрыцці якога, дарэчы, бралі ўдзел пісьменнікі з Беларусі, Расіі і Украіны.

— Непасрэдна вамі і арганізацыяй створана шмат культурных і літаратурных традыцый, дзякуючы чаму Гомель і Гомельшчыну ў значнай ступені можна лічыць сталіцай славянскага літаратурнага фестывальнага руху…

— У любым выпадку, ужо 16 гадоў стараемся рабіць усё магчымае, каб такія традыцыі з'явіліся і каб Гомельшчына — радзіма чатырох народных пісьменнікаў Беларусі — была прыцягальнай не толькі для славянскіх літаратараў, але і для творцаў з краін СНД. Так, пісьменніцкая арганізацыя з'яўляецца заснавальнікам і арганізатарам Міжнароднага фестывалю-свята «Славянскія літаратурныя дажынкі». Фестываль стаў брэндам вобласці і краіны, ён накіраваны на выяўленне і падтрымку таленавітых аўтараў і арганізацыю іх культурна-творчай дзейнасці ў сферы літаратуры. Творчыя сустрэчы, канферэнцыі, форумы маладых літаратараў ладзяцца як самастойна, так і сумесна з органамі ўлады на месцах, установамі культуры, адукацыі, грамадскімі структурамі. Варта падкрэсліць, што гэта нялёгкая, напружаная праца — падрыхтоўка і правядзенне літаратурных форумаў, тым больш за кошт прыцягнення спонсарскіх сродкаў. Дарэчы, ад з'езда намі праведзены пяць «Славянскіх літаратурных дажынак». Толькі ў межах сёлетняга, 16-га па ліку, з захаваннем санітарных умоў праведзены 24 творчыя падзеі, у тым ліку міжнародная канферэнцыя славянскіх літаратараў. А ўдзельнікамі і гасцямі форуму былі 22 замежныя пісьменнікі (прадстаўнікі пісьменніцкіх арганізацый Саюза пісьменнікаў Расіі і Украіны), пісьменнікі аддзялення СПБ, звыш 150 маладых аўтараў і фіналісты сямі абласных літаратурных конкурсаў. Ганаровым госцем упершыню стаў народны артыст Беларусі, член СПБ Эдуард Ханок.

З 2019 года абласное аддзяленне СПБ пры падтрымцы Жыткавіцкага райвыканкама арганізоўвае ў г. Жыткавічы абласны фестываль літаратуры, культуры, мастацтва і народных традыцый «На зямлі Кірылы Тураўскага». Штогод узровень форуму павышаецца, сёлета нават заснавана найвышэйшая ўзнагарода фестывалю — літаратурная прэмія «Палескія росы», яе атрымалі 6 дзеячаў культуры, адукацыі, пісьменнікаў рэгіёна і замежжа.

— А наколькі шырока вядзецца работа з творчай моладдзю?

— Мы актыўна працуем з пачаткоўцамі. Падтрымліваем іх з дапамогай літаратурных конкурсаў і творчых кансультацый. Так, для творчай моладзі сіламі кіраўніцтва і творцаў аддзялення праведзены: пяць Форумаў маладых літаратараў «Слова», 16 майстар-класаў (2017—2021), Міжнародны злёт літаб'яднанняў краін СНД (2019 год), 32 літаратурныя конкурсы, 12 конкурсаў сумесна з рознымі арганізацыямі-партнёрамі. Пры Савеце аддзялення створаны кансультацыйны пункт: вядомыя пісьменнікі, краязнаўцы і публіцысты даюць парады па пытаннях працы з літаратурнымі творамі, рукапісамі, выданні кніг, правядзенні творчых вечароў, літаратурных мерапрыемстваў. Толькі сёлета мы наладзілі 7 літаратурных конкурсаў, у якіх прынялі ўдзел звыш 2 тыс. аматараў, і 60 % з іх — дзеці, навучэнцы, студэнцкая моладзь. А найбольшая колькасць паэтычных і празаічных спроб была даслана на адкрытыя літаратурныя конкурсы «Сям'я — аснова шчасця і кахання» і «Белыя вішні і яблыні», прысвечаныя 100-годдзю І. Шамякіна і І. Мележа, а таксама на конкурсы «Незабыўны подзвіг. Міша Мароз» і «Памяці Міколы Гамолкі». Для нас конкурсы — гэта няпростая праца: усё трэба было прачытаць, прааналізаваць, адзначыць станоўчае і недахопы, каб потым параіць нешта юнаму аўтару. З мэтай падтрымкі самых таленавітых канкурсантаў мы выдалі невялікі зборнік іх твораў з назвай «Матчын хлеб».

Работа з творчай моладдзю вядзецца ў тым ліку і на міжнародным узроўні. Менавіта са «Славянскіх літаратурных дажынак» вырас яго фестываль-пабрацім — ужо шэсць гадоў існуе Міжнародны фестываль маладзёжнай паэзіі і перакладаў «Берагі дружбы» (Няклінаўскі раён Растоўскай вобласці), які, дзякуючы нястомнай працы беларусаў, расіян і ўкраінцаў, аб'ядноўвае творчую моладзь славянскіх краін. Мы аказваем усебаковую падтрымку маладым талентам, падтрымліваем аматарскія літаратурныя аб'яднанні і клубы, створаныя ў раёнах пры бібліятэках ці адукацыйных установах, курыруем літаратурныя грамадскія фарміраванні ў абласным цэнтры (працуе школа «Малады літаратар» на базе Славянскай бібліятэкі, літаб'яднанне «31 мерыдыян» на базе бібліятэкі імя Герцэна) і іншыя, якія разам з пісьменніцкай арганізацыяй прыцягваюць маладых аўтараў і аматараў мастацкай творчасці да ўдзелу ў асветніцкіх акцыях. Увогуле, дзякуючы нашай падтрымцы, праз конкурсы, фестывалі, творчыя акцыі, першыя публікацыі мы вырасцілі нямала таленавітых аўтараў, многіх з іх рэкамендавалі да прыёму ў Саюз пісьменнікаў.

— Аддзяленне, наколькі вядома, займаецца і выданнем альманахаў…

— Так, з мэтай папулярызацыі новых мастацкіх твораў літаратараў штогод рыхтуем і выдаём альманах «Літаратурная Гомельшчына» — на працягу 2016—2021 гадоў з друку выйшлі восем зборнікаў. З гэтай жа мэтай, а таксама для наладжвання творчых сувязей са славянскімі пісьменнікамі з 2019 года пры падтрымцы сваіх калег рыхтуем міжнародны альманах «Літара» на трох мовах (выйшла 6 нумароў, у апошнім змешчаны, напрыклад, паэтычныя і празаічныя творы на тэмы кахання і веры 100 славянскіх пісьменнікаў). Штогод аддзяленне выпускае таксама зборнікі вядомых маладых аўтараў, якія дасягнулі значных творчых вынікаў. Так, за 5 гадоў выдадзена 12 такіх зборнікаў, яны распаўсюджваюцца ў бібліятэчныя ўстановы вобласці і краіны. Таксама за апошнія гады аддзяленнем падрыхтаваны і выдадзены чатыры калектыўныя зборнікі (Беларусь — Расія — Украіна): «Славянскае сонца» (Гомель — Краснадар», 2017, Гомель), «На Славянском поле» (Гомель — Бранск», 2018, г. Гомель), а таксама сумесна з Саюзам пісьменнікаў Украіны два зборнікі паэзіі і прозы (2019, 2021 гады).

— А якія планы творчай суполкі на наступны, 2022 год?

— Іх шмат, як творчых, так арганізацыйных. Галоўнае — мы будзем жыць адным жыццём са сваім народам. Будзем імкнуцца, каб добрая кніга была запатрабавана ў кожнай сям'і. Дзеля гэтага прадоўжым працу ў межах распачатага сёлета на Гомельшчыне Года класічнай літаратуры і чытання ў гонар 100-годдзя І. Мележа і І. Шамякіна, юбілеяў Я. Купалы і Я. Коласа, шырока адзначым 100-годдзе М. Гамолкі. Думаю, належна правядзём і літаратурныя фестывалі, пастараемся, каб шырылася супрацоўніцтва з пісьменнікамі Расіі і Украіны і возьмем самы актыўны ўдзел з новымі кнігамі ў Дні беларускага пісьменства ў Добрушы.

Гутарыла
Валянціна КАНСТАНЦІНАВА
Фота з архіва Гомельскага абласнога аддзялення СПБ

У сілавым полі Беларусі

Спецыялістам даўніны, асабліва тым, хто рупіцца пра наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці таму ці іншаму аб'екту, вядома такое вызначэнне, як прысваенне спадчыны. Для неабазнанага вуха гэта можа прагучаць агрэсіўна, па-захопніцку. Адразу супакоім. Гаворка ідзе пра заключны этап — зрабіць сваім, асвоіць, — якому папярэднічае цэлы шэраг прамежкавых вынікаў: вывучэнне, апісанне, кансервацыя, рэстаўрацыя і інш.

Шляхам засваення

На нашу думку, менавіта такі падыход метадалагічна апраўданы і дзейсны пры сённяшнім звароце да літаратурнай класікі, якая хоць і знаходзіцца ў агульным з беларускім інфармацыйна-культурным полі, але апрыёры належыць суседняму народу і вялікай, прызнанай ва ўсім свеце літаратуры.

Карані роду Фёдара Дастаеўскага (1821—1881) знаходзяцца ў Дастоеве, што ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці. На гэтым факце даўно сфакусіравана ўвага даследчыкаў. У самім жа населеным пункце першачарговая культурна-асветніцкая праца — годнае ўшанаванне, мемарыялізацыя славутай мясціны.

Вывядзенню тэмы на якасна новы ўзровень і маштаб асэнсавання, міжнароднай канвертуемасці, думаецца, можа дапамагчы зварот да краязнаўчых распрацовак 1920-х гадоў. Працэс вяртання імёнаў добра вядомы ў нашых культурна-гістарычных рэаліях, актуальны ён і для сённяшняй расійскай гуманітарыстыкі.

Пасля глабальных тэктанічных зрухаў пачатку XX ст., рэвалюцый 1917 г., утварэння дзяржавы з беспрэцэдэнтным грамадскім ладам на парадку дня паўставала пытанне культурнай спадчыны. Пры парушэнні манаполіі на гэтую сферу абедзвюх сталіц былой Расійскай імперыі акцэнты змяніліся ў бок рэгіянальнага вывучэння. Пад агульнай шыльдай краязнаўчых даследаванняў фарміруюцца асобныя школы і напрамкі.

Новы час — новая метадалогія

У 1920-х гг. у Расійскай Федэрацыі ў рэчышчы лакальна-гістарычнага метаду ў літаратуразнаўстве і культуралогіі працуюць шэраг знакамітых вучоных: Мікалай Анцыфераў, Іван Грэўс, Павел Сакулін, Мікалай Піксанаў і інш. На працягу апошніх трох дзесяцігоддзяў іх працы актыўна перавыдаюцца, а спадчына вывучаецца. У Маскве і Пецярбургу праводзяцца традыцыйныя «Анцыфераўскія чытанні».

Адразу пасля выхаду кнігі М. Піксанава «Абласныя культурныя гнёзды (Гісторыка-краязнаўчы семінар)» (Масква — Ленінград, 1928) на яе звярнулі ўвагу і ў сталіцы БССР. Толькі ў «Літаратурным дадатку да газеты "Савецкая Беларусь"» былі апублікаваны два допісы. У першым паведамлялася пра тое, што «расейскі знаток літаратуры» змясціў у сваёй кнізе раздзел «Беларуская культура і літаратура» (№ 1 ад 29 студзеня 1928 г.). Другі допіс уяўляе сабой разгорнутую рэцэнзію Н. Фінкельштэйна, змяшчае агульную характарыстыку навукова-практычнай канцэпцыі М. Піксанава, праводзіць паралелі з беларускімі напрацоўкамі (№ 14 ад 9 верасня 1928 г.).



Фёдар Дастаеўскі.

унесеныя ў радаводную кнігу Каўказскай вобласці (1804—1925)» (Масква, 1913), «Князі Назаравы: вопыт пакаленнага роспісу» (Тула, 1915) і інш. На старонках некалькіх выданняў С. Любімаў паслядоўна і фактаграфічна адстойваў украінскае паходжанне Ф. Дастаеўскага: «Литературная мысль» (1922, № 1), «Достоевский. Статьи и материалы» (Ленінград, 1925).

Ад каранёў да вершалін

У 1925 годзе гісторык Іван Грэўс (1860—1941) і культуролаг Мікалай Анцыфераў (1889—1958) ажыццявілі падарожжа па старажытных рускіх гарадах. Вядомыя вучоныя наведалі Яраслаўль, сустрэліся з мясцовымі аматарамі даўніны. Асабліва ім запомніўся бібліятэкар Адам Багдановіч.

Бацька песняра чыстай красы ў жніўні 1926 года браў удзел у краязнаўчым з'ездзе ў Рыбінску (Яраслаўскі край). Пра гэтую сустрэчу Мікалай Анцыфераў пакінуў невялікія мемуарныя запісы, апублікаваныя ў Маскве пад назвай «Беларус» толькі ў 2018 годзе.

Адам Ягоравіч пераказваў сваю паездку ў Мінск у 1923 годзе, здзіўляў калег перакананасцю: «Давайте договоримся. Я белорус и патриот своей родины. Каждый народ должен найти свое место в истории, свое призвание. У каждого свой путь. Мы поставлены историей между двумя выдающимися славянскими народами — русским и польским».

Асабліва ўражаны былі слухачы і ў Мінску, і ў Рыбінску канцэптуальнымі поглядамі Адама Багдановіча на культурную спадчыну: «Великая русская культура от того великая, что у нее было три крепких корня. Гоголь, Достоевский уходят корнями вглубь Украины и Белоруссии, точнее Литвы. Пушкин — он тоже наш, потому что вся русская культура — создание трех народов, в том числе и нашего». Мікалаю Анцыфераву, аўтару кнігі «Пецярбург Дастаеўскага» (1923), выказванне Адама Багдановіча, відаць, таму і запомнілася, бо знаходзілася ў сферы ўласных навуковых зацікаўленняў.

Нацыянальны гістарычны архіў (Польшча).

Сядзіба Дастаеўскіх — Ордаў (сярэдзіна XVIII — 1943 г.). Дастоева, 1920-я гг.

У навуковай літаратуры монаэтнічную прыналежнасць продкаў Фёдара Дастаеўскага адным з першых парушыў Сяргей Любімаў (1872—1935), вядомы спецыяліст у генеалогіі, аўтар кніг «Тытулаваныя роды Расійскай імперыі» (Пецярбург, 1910), «Дваранскія роды,

Мінскі ракурс

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у першы год свайго існавання апрабаваў новую форму мерапраемстваў, прысвечаных юбілейным датам і праблемам сучаснага жыцця, — *публічныя пасяджэнні*. Форумы такога кшталту былі арганізаваны ў гонар 15-годдзя літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы, у памяць пра Мікалая Някрасава.

Урачыстае пасяджэнне Савета прафесараў БДУ, прысвечанае 100-годдзю з дня нараджэння Ф. Дастаеўскага, адбылося ў нядзелю 27 лістапада 1921 года. Былі агучаны даклады: «Праблема ўсходу і захаду ў творчасці Дастаеўскага» (У. Пічэта), «Метады ў творчасці Дастаеўскага» (І. Салаўёў), «Навуковая дакладнасць псіхапаталагічных вобразаў у творчасці Дастаеўскага» (С. Балкавец).

Крывіцкая канцэпцыя

У Літоўскай Рэспубліцы Вацлаў Ластоўскі апублікаваў артыкул пад характэрнай назвай-канстатацыяй «Тодар Дастаеўскі і Адам Міцкевіч — сыны крывіцкага народнага генія» («Крывіч», 1926, № 11). Большая частка тэксту прысвечана не ўласна пісьменнікам, а мове, якая «ў наш век… становіцца нацыянальнай мэтай». Аўтар вядзе гаворку пра сучасны «апафеоз нацыянальнай мовы», праводзіць экскурс у глыбокую гісторыю — часы Аляксандра Македонскага, Вавілона і Егіпта, Рымскай імперыі, Еўропы ад эпохі Адраджэння да нашых дзён.

Пра класіка рускай літаратуры — сціслы абзац: «Тодар Дастаеўскі — шляхціц Менскага павета па дзядах і прадзедах і сын доктара, які жыў у Маскве ў часы Мікалая I, у тыя часы, калі "рускасць" і "праваслаўе" былі да такой меры сінонімамі, што нават 100 000 латышоў у Ліфляндыі, калі ўсякімі няпраўдамі ўдалося іх перавярнуць з лютэранства ў праваслаўе, залічылі "русскими", то Тодар Дастаеўскі мог пісаць толькі па-расійску, а не другой якой мовай».

Завяршэнне артыкула цалкам публіцыстычнае, трыбуннае: «Няхай расійская пісьменнасць пышаецца Дастаеўскім, няхай польскае вока загараецца агнём, калі называецца імя Адама Міцкевіча, — крыўскі народ ведае, што абодва яны цела ад цела і кроў ад крыві яго, а абодвух — і Дастаеўскага і Міцкевіча — залічае да свайго алімпу. Слава Тодара Дастаеўскага і Адама Міцкевіча — гэта слава крыўскага нацыянальнага генія».

Узвышэнскі арыенцір — сусветная класіка

У 1930 годзе дэбютны твор Фёдара (Тодара) Дастаеўскага — раман у лістах «Бедныя людзі» (1846) — выйшаў у перакладзе на беларускую мову Язэпа Плашчынскага, больш вядомага пад псеўданімам Язэп Пушча (1902—1964). Гэты літаратурны вопыт актыўнага маладнякоўца, а потым узвышэнца яшчэ не стаў аб'ектам спецыяльнага тэксталагічнага аналізу. Хоць ён і рэпрэзентаваў асваенне рускай класікі, адпаведны ўзровень нацыянальных культурных амбіцый, рэалізацыю творчых маніфестаў 1920-х гадоў.



З фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Раман «Бедныя людзі». Мінск, 1930 г.

Адметнасць гучання перакладзенага рамана праілюструем зачыннымі радкамі першага ліста чыноўніка Макара Дзевушкіна да дзяўчыны-сіраты Варвары (Барбары) Дабрасёлавай:

Даражэнькая мая Барбара Аляксееўна!

Учора быў я шчаслівы, празмеру шчаслівы, па самае годзе шчаслівы! Вы хоць раз у жыцці, упірачка, мяне паслухаліся. Вечарам, у гадзін восем, прачынаюся (вы ведаеце, матачка, што я гадзінку-другую люблю паспаць пасля службы), свечку дастаў, рыхтую паперы, вастру пяро, раптам, знячэўкі, падымаю вочы, — яйправа, у мяне сэрца вось так і затрапяталася! Дык вы такі скемілі, чаго мне хацелася, чаго сэрданьку майму жадалася!..

Экзэмпляр інтэрпрэтаванага па-беларуску рамана з Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі факусіруе ўвагу і на іншых культурна-часавых характарыстыках. Вокладку кнігі, што выйшла ў Белдзяржвыдавецтве, аформіў мастак Філіпоўскі (імя не ўказана). Магчыма, так падпісаўся Міхась Філіповіч (1896—1947), сябра Усебеларускага аб'яднання мастакоў, удзельнік міжнароднай выстаўкі «Мастацтва кнігі» (Лейпцыг, 1927). Пра пэўны перыяд бібліятэчнага жыцця выдання сведчыць штамп: «Габінэт Пэдагогічнага тэхнікуму».

У XXI ст. у Мінску выдадзена некалькі кніг, якія змяшчаюць творы Фёдара Дастаеўскага ў перакладзе на беларускую мову. Такім чынам сфарміраваны своеасаблівы тэкстава-інтэрпрэтацыйны дыскурс нацыянальнага асваення рускай класікі. І гэта толькі адзін са складнікаў перспектыўнай маштабнай працы ў напрамку спасціжэння і актуалізацыі мінуўшчыны, міжнароднага культурнага супрацоўніцтва і ўзбагачэння.

Мікола ТРУС,
кандыдат філалагічных навук

У бабулі Ніны — адны дзясяткі

Адразу ўзнікае пытанне, што ж гэта за бабуля такая, якая вучыцца яшчэ ў школе ці ў якой-небудзь іншай навучальнай установе. Як вядома, веды там ацэньваюцца па дзесяцібальнай сістэме, а дзясятка — найвышэйшая адзнака. Калі быць больш дакладным, то і не бабуля яна. Для некаторых ужо і прабабуля. І не сама ў школе вучыцца, а іншых вучыць. Дабру, сумленнасці, справядлівасці. А яшчэ — каб вучні слухаліся старэйшых, любілі прыроду. Бо яна — не звычайная бабуля-прабабуля, а выдатная беларуская паэтэса Ніна Галіноўская, аўтар дзясяткаў кніг для самых маленькіх і крыху старэйшых дзетак.

Паколькі яе прызванне — найперш паэзія, хоць ёсць і празаічныя творы, то хочацца, каб і дзеткі яе любілі. Захапіць жа іх магчыма толькі цікавымі, па-майстэрску напісанымі творамі. Такімі, якія, не задумваючыся, можна ацэньваць толькі на выдатна. Імі напоўнена і кніга Ніны Васільеўны «У казачным лесе», якая выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда». Па сутнасці, напярэдадні Новага года.

Да яго, праўда, як быццам, яшчэ і далекавата, амаль два месяцы. Ды і па надвор'і не відаць, каб восень спяшалася саступіць свае правы зіме. Але дзеткі, несумненна, даўно жывуць чаканнем гэтага радаснага свята. Новы ж год — не толькі ёлка і Дзед Мароз, Снягурачка, але і падарункі. Сярод іх, безумоўна, будуць і цікавыя кніжкі. Ад матуль і татаў, бабуль і дзядуль. Верыцца, што сярод іх знойдзецца месца і гэтай, напісанай Нінай Галіноўскай. Ужо сваёй назвай яна сведчыць, што чакаецца незвычайнае падарожжа ў свет дзівосаў. Інакш і быць не можа, калі гэта запрашэнне не проста ў лес, у якім, добра прыглядзеўшыся, і так шмат чаго (і каго) незвычайнага, а ў лес казачны.

Верш «Казка і ява», якім кніжка адкрываецца, сведчыць, што ў ім яднаецца фантастычнае і рэальнае. Сам чамучка — няважна хлапчук ці дзяўчынка — даўно чакае гэты цуд:

У лесе схавалася казка.
На елцы яна ці сасне.
Напэўна, зялёная маска
Хавае яе ад мяне.
І доўга я казку шукаю —
Нідзе непаседы няма.
Вось зараз вазьму,
пагукаю —
Адклікнецца, можа, яна.

І гукае: «Дзе ты, казка? Ау-у!», а яна паўтарае: «А-у-у!». Адказвае цікаўнік казцы: «Я насустрач бягу-у»:

Імчацца і дрэвы, і травы —
Дзівосны зялёны экспрэс.
Змяшаліся казка і ява…

Гэтае «змяшэнне», дзякуючы майстэрству Ніны Галіноўскай, прыводзіць да таго, што казачныя рэаліі ў творах удала мацуюцца на тым рэальным, сведкамі чаго хлопчыкі і дзяўчынкі з'яўляюцца ці не штодня. Розніца толькі ў тым, што не яны, а жывёлы, птушкі, іншыя персанажы ў гісторыях, расказаных Нінай Васільеўнай, трапляюць у нечаканыя сітуацыі.

Аднак па тым, як яны сябе паводзяць, што робяць, дзеткі лёгка здагадаюцца, чым можна захапляцца. Над чыімі ўчынкамі задумацца, паразважаць, што добра, а што кепска. А то і даць сабе слова больш так не рабіць. Яшчэ, што таксама важна, упэўняцца, як гумар, жарт прыўносяць у звычайнасць будняў тое, што не толькі выклікае ўсмешку, але і ўзнімае

настрой. Як жа ні рэагаваць на іх паводзіны, калі персанажы твораў добра знаёмыя.

Напрыклад, заяц. Хлопчыкі і дзяўчынкі з ім у кніжцы сустракаюцца неаднойчы. І ў розных сітуацыях. Узяць верш «Зай-разгубляй». Завітаў неяк гэты заяц у магазін, каб купіць морквы. Пачаў разлічвацца, а грошы ніяк не можа знайсці. Стаў Зай-разгубляй уголас разважаць, дзе мог іх згубіць. Слухала-слухала яго Ліска-прадаўшчыца, ды і кажа: «Не згубі трусы і майку!»

У вершы «Ліса і Заяц» — зусім іншы шарачок. Не расцяпа, а знаходлівы. Рыхтуючыся да зімы, не чакае, калі яго футра з надыходам яе памяняе колер. Сам рыхтуе для гэтага фарбу. Яшчэ ў адным вершы — «У лясным трамваі» — ён не абы хто, а вадзіцель Капусцін Зай. Даўмеўся да таго, пра што не здагадаліся пасажыры — «пяць бабуль, унукаў пяць». Бабулі запрашаюць іх садзіцца на вольныя месцы, унукі — бабуль. У выніку ўсе стаяць. Капусцін Зай хутка знайшоў выйсце. На прыпынку выйшаў з кабіны і прапанаваў:

— Вы, бабулі, пасядзіце.
— Ну а як жа нашы ўнукі?
— Вы вазьміце іх на рукі.

А колькі досціпу ў вершы «Наперагонкі»!

— Дзед Мароз,
Абуй валёнкі.
Пабяжым наперагонкі.
Раз, два, тры!
Выходзь на старт!
Пакажы прысутным гарт!

Выйграў бы саперніцтва, ды… «Дзед Мароз упаў у снег: // Нечакана на хаду // Наступіў на бараду».

Ёсць у кнізе і тры творы, што маюць падзагаловак «Гульня»: «На прагулку ў лясок», «Дзеці і дождж ык», «Хутка зіма». Іх, асабліва трэці, па вартасцях ацэняць і выхавальнікі дзіцячых садоў, настаўнікі малодшых класаў у пазашкольнай рабоце. Надыход зімы можна лёгка перадаць праз невялічкае прадстаўленне, бо ў творы прысутнічае драматургічная аснова. Ёсць Вядучы, ёсць і ўдзельнікі гэтага дзейства: Ліска, Заяц, Вавёрка, Мядзведзь… І, як заўсёды, прысутнічае ненавязлівы напамін, што ў жыцці ўсё жывое з'яднана між сабой. Звяры пра гэта напамінаюць і запрашаюць:

— Добра нам сярод дзяцей,
Шчырых і лагодных.
Вы прыходзьце ў лес часцей
Ва ўсе поры года.

Маецца на ўвазе лес як частка прыроды. Але было б няблага, каб дзеткі часцей заходзілі і ў лес казачны Ніны Галіноўскай. Не толькі ў гэтай кнізе, але і ў іншых, напісаных ёю. Ніна Васільеўна даўно прызнаны майстар беларускай дзіцячай літаратуры. Цяпер жа чарговы раз пацвердзіла, што яе паэтычнае майстэрства самай высокай пробы.

Глеб ПРАКАПЕНЯ

Жывыя токі паэзіі

Трымаю ў руках дэбютны вершаваны зборнік Алёны Папко, які сёлета пабачыў свет у выдавецтве «Альтэрнатыва», з цёплай і дакладнай назвай «Мой сад».

Расчыніць браму ў сад сваёй душы, паказаць, наколькі простыя падзеі могуць быць шматзначнымі, а душэўнае надвор'е зменлівым, сапраўды цяжка, бо паэт безабаронны перад навакольным светам са сваім уменнем дзяліцца пачуццямі. А яны такія крохкія, трапяткія… Алёне Папко ўдалося не толькі раскрыцца, раскрыліцца, але і аб'яднаць у творчым палёце тых, хто побач, — найперш вучняў, калег, родных. Зборнік аздоблены іх графікай, і кожны малюнак — чароўнае рэха, якое жыва адгукаецца на паэтычную прыгажосць, дае магчымасць адчуць глыбіню пачуццяў, думак.

Натхняльнікам для выдання кнігі, рэдактарам і аўтарам прадмовы выступіў настаўнік беларускай мовы і літаратуры СШ № 1 г. Бярозы, аўтар і суаўтар шматлікіх вучэбных дапаможнікаў па беларускім літаратурным чытанні і літаратуры Мікола Жуковіч. На яго думку, лірычная гераіня аўтаркі «паўстае рэалісткай і адначасова філосафам, дарадчыкам і дзесьці разгубленай ахвярай абставін, дачкой і няшчаснай закаханай». Але мне здаецца, што дзявочага аптымізму, жадання перафарбаваць абставіны ў светлыя колеры ў вершах значна больш. Што і робіць паэзію



Алёны Папко такой прыцягальнай, празрыста-акрыленай.

У першы раздзел «З птушынага бачыць палёту Край, што мне дарагі» ўвайшлі вершы, прысвечаныя радзіме, блізкім людзям. Гэта надзвычай яркая вандроўка, дзе кожны ўздых — падзея, дзе кожны крок — любоў:

Цвіце зямля рамонкамі і мятай,
Маліннік заплятаецца ў жыццё.
Мне не парушыць казачнага свята,
Не наталіцца сонечнасцю дзён.

Паэтэса збірае ўсё добрае, як дзівосныя кветкі ў садзе, і з хваляваннем захоўвае чароўныя ружы-ўспаміны, выпраменьваючы сваё шчасце, якое не заўсёды лёгкае:

А як успомніцца,
Дык да ўсмешкі, да слёз!
Ведаеш, мама, а ў нас з табой
Кветкавы лёс.
Як жа іначай! —
Вясна ўзніме крылы свае,
Бэзам расквечаны май
За сабой пазаве.

Асобна вылучаны вершы, прысвечаныя роднай мове, якую паэтэса называе сонечнай. І з гэтай прамяністай пяшчотай вядзе свайго чытача ад старажытнасці да свайго сэрца, да прыгожай рэчаіснасці, дзе ўсё гарманічна — і мілагучная мова, і «звонкая лясная цішыня», у якой губляецца дрэннае, ненадзейнае:

Я іх прымаю ў спадчыну сваю:
Зямлю — з ёй сэрцу цёпла на марозе!
І мову — быццам з вамі гавару —
І чую крокі вашы на дарозе…

У трэцім раздзеле «Давайце з Вамі гутарыць пра вечнае…» вясна прысутнічае ва ўсім: у з'явах прыроды, настроі, жаданні застацца ў памяці блізкіх вясёлай, шчаслівай. І калі ёсць сум — ён сыходзіць з першым цяплом, а горкая ўсмешка мяняецца на ўпэўненую надзею. Дзень за днём прыходзіць адчуванне, што наперадзе столькі няходжаных сцежак, што трывогі абавязкова сыдуць, як талая вада:

Усё будзе добра.
Прага адзінага:
Добрага.
Звонкага.
Роднага.
Шчырага.

Апошні раздзел «Я застануся ў памяці тваёй» пераносіць нас у алею Кахання. Тут змешчаны і верш «Мой сад». Сад лірычнай гераіні прамок ад дажджу, альбо ад сумных слоў развітання, кветкі быццам згасаюць ад тугі, а спелыя ягады маліны балюча нагадваюць салодкасць летніх дзянькоў. Але ў вершах столькі жыватворнай сілы, столькі прыкмет любові, незабыўных вобразаў, што, здаецца, лірычная гераіня перамагае саму сабе. Хаця зрабіць гэта ёй вельмі цяжка, бо яна ў сваім жыцці не ігрок, а хутчэй за ўсё міласэрны філосаф, здольны ад расстання толькі ўзбагаціцца:

Шчаслівая тады — без жалю ў сэрцы —
Зраблю наперад горды крок. Глядзі!
І стане мне надзейным братам сонца,
Сястрою — берасцянка ў вышыні.

Жывыя токі паэзіі Алены Папко абавязкова абудзяць у чытача самыя лепшыя пачуцці, падораць асалоду ад сутыкнення з таямнічым светам любові да жыцця, да роднага куточка, роднай мовы, блізкіх і дарагіх людзей.

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ

Літаратура са старых канвертаў

Амаль паўгода мінула, як айчынныя літаратурныя часопісы перайшлі пад дах выдавецтва «Мастацкая літаратура». Якія змены плануюцца ў выданнях? Пра што будуць найцікавейшыя публікацыі? На гэтыя і іншыя пытанні пра змест часопісаў у наступным годзе адказалі галоўныя рэдактары «Полымя», «Нёмана» і «Маладосці».

Віктар ШНІП: «…Быць у чымсьці нечаканымі!»

Наступны год для часопіса «Полымя» юбілейны: у снежні 2022 года выданню спаўняецца 100 гадоў. Як высветлілася, я — дванаццаты рэдактар. Тое, што друкуецца на старонках часопіса, не заўжды залежыць ад галоўнага рэдактара, а, хутчэй, ад аўтараў. На жаль, новых твораў не напішуць ні Уладзімір Караткевіч, ні Міхась Стральцоў, ні Рыгор Барадулін… Часопіс адлюстроўвае літаратурны працэс, і ў друку з'яўляецца тое, што прапаноўваюць пісьменнікі.

Між тым пэўныя матэрыялы ў рэдакцыі ўжо ёсць. Гутарка датычыць блока, што ідзе пасля традыцыйных паэзіі і прозы: гэта ўспаміны, згадкі, ліставанне. Дарэчы, нярэдка другая палова часопіса бывае больш цікавая, чым першая. Так, да юбілею выдання запланаваны да друку ўспаміны тых, хто працаваў у часопісе. Згадкі аднаго з рэдактараў — Міколы Мятліцкага, які ўзначальваў «Полымя» на працягу 12 гадоў — пачалі ўжо публікавацца, першая іх частка пабачыла свет у кастрычніцкім нумары. Гэта адмысловы для часопіса аповед — «Сполах даўніх зарніц». Пачынаецца ён здалёк: з часоў дзяцінства і юнацтва аўтара, а гэта 1950—1960-я гады. Надзвычай цікава, як у яго ўсё складвалася, з чаго пачынаўся творчы чалавек. Другая частка ўспамінаў М. Мятліцкага — «Універсітэт». Там пісьменнік распавядае, як і з кім ён вучыўся, з кім з пісьменнікаў знаёміўся, з кім пачынаў хадзіць па рэдакцыях. Знаёмствы маладога Міколы Мятліцкага з класікамі надзвычай захапляльныя. Трэцяя частка называецца «Літаратура і мастацтва» — аб рабоце ў «ЛіМе». Працаваў ён у газеце няшмат, але, тым не менш, яго расповед — своеасаблівая гісторыя беларускай літаратуры. Пасля ідуць згадкі пра «Мастацкую літаратуру», і скончацца ўспаміны часткай аб рабоце ў часопісе.

Плануецца, што ў кожным нумары будуць згадкі пра «Полымя». Дарэчы, не толькі пісьменнікаў. Звяртаюся і да чытачоў часопіса: дасылайце нам свае гісторыі пра выданне, расповеды пра тое, што яно значыць у вашым жыцці, як вы яго выпісвалі, чыталі, чаго чакалі… Бо творы, якія на пэўны час яшчэ не выйшлі кніжкай, але ўжо надрукаваны ў часопісе, успрымаюцца па-іншаму: ты — першы чытач…

Рэдакцыя звярнулася і да іншых пісьменнікаў з просьбай напісаць успаміны: да Казіміра Камейшы, Андрэя Федарэнкі, Алеся Бадака, Алеся Жука, Анатоля Вярцінскага, Васіля Зуёнка, Георгія Марчука, Алеся Марціновіча, Васіля Шырко, Анатоля Казлова, Міхаіла Шыманскага. Магчыма, хтосьці з творцаў прапануе сам, бо гісторыя часопіса — гэта яшчэ і гісторыя беларускай літаратуры.

У першым нумары новага года пачынаем друкаваць дзённікі Вячаслава Адамчыка з 1987 года, якія яшчэ не публікаваліся. Падрыхтавана першая порцыя — 65 старонак — і другая — 40 старонак. Надзвычай цікава адлюстравана тое, чым жылі пісьменнікі ў гады, што папярэднічалі часу, калі Беларусь атрымала незалежнасць, як творцы сябе пачувалі і пра што пісалі…

Анатоль Бутэвіч прапанаваў адмысловы твор пад назвай «Жыццё вучыць, альбо Мае жыццёвінкі (з нявыдуманага)». Тут ёсць раздзел «Добрыя словы ад добрых людзей», які пачынаецца з ліставання з Нінай Мацяш (якое яшчэ не друкаваліся). А цікава гэта не толькі для даследчыкаў, але і для маладых пісьменнікаў, дый увогуле тых, хто цікавіцца беларускай літаратурай. Можна шмат даведацца з гэтых лістоў. Запланаваны да друку і пісьмы дачкі пісьменніка Адама Бабарэкі Алесі — яе адшукаў у Маскве і перапісваўся з ёю Сяргей Чыгрын. Выглядала ліставанне такім чынам: ён задаваў ёй пэўнае пытанне пра часы, калі быў жывы яе бацька, пра тагачасных пісьменнікаў, у тым ліку і Адама Бабарэку, а яна адказвала. Будуць у друку апошнія лісты Якуба Коласа да жонкі.

Пабачаць свет не друкаваная дагэтуль эпісталярная спадчына Івана Шамякіна. Падборка цікавая тым, што гэта звароты да дзяржаўных дзеячаў, у тым ліку да міністра культуры БССР Юрыя Міхневіча, старшыні выканкама Мінскага гарадскога савета дэпутатаў Георгія Таразевіча, старшыні Вярхоўнага савета Петруся Броўкі; асабліва цікавыя пісьмы першаму сакратару ЦК КПБ Пятру Машэраву.

Раіса Баравікова прапануе да друку ўспаміны пра пачатак творчага шляху і сустрэчы з Канстанцыяй Буйло «Падарункі жыцця». Што да Канстанцыі Буйло, то высветлілася: у музеі Янкі Купалы ёсць яе раней не друкаваныя вершы, прысвечаныя класіку. Яны з адпаведнымі каментарыямі плануюцца да друку ў нумарах за першае паўгоддзе. Як і невядомыя раней успаміны Ігара Брусевіча пра свайго бацьку Максіма Брусевіча, педагога і публіцыста, дзеяча нацыянальнага вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, ліставанне мастака, паэта, настаўніка Юльяна Сергіевіча з дзеячамі беларускай культуры. Адмысловыя запіскі этнографа Сяргея Сахарава, якія рыхтуе краязнаўца Сяргей Казлоўскі.

Калаж Віктара Калініна.

Многія навукоўцы і даследчыкі працуюць над прапанаванымі ім тэмамі: Іван Саверчанка, Мікола Мікуліч, Мікола Трус, Жана Шаладонава, Валерый Максімовіч, Алесь Бельскі, Ігар Запрудскі, Іван Штэйнер, Васіль Старычонак, Уладзімір Чарота.

Чытачам прыйшліся даспадобы лірычныя мініяцюры Казіміра Камейшы «Паміж кубкам і вуснамі», што былі ў друку раней. Плануецца іх працяг: там шмат дэталяў пра XX стагоддзе, з гісторыі літаратуры.

Што да мастацкіх твораў, то на першы нумар 2022 года запланаваны раман Уладзіміра Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне». Акрамя таго, у першым паўгоддзі на старонках часопіса пабачаць свет аповесці і апавяданні Уладзіміра Гаўрыловіча, Георгія Марчука, Віктара Гардзея, Алеся Бадака, Віктара Праўдзіна, Людмілы Рублеўскай, Раісы Баравіковай, Васіля Ткачова, Алены Брава, Адама Глобуса і іншых; вершы Міколы Маляўкі, Віктара Гардзея, Міколы Мятліцкага…

Акрамя таго, запланаваны і цікавыя гутаркі. Мы распачалі супрацу з БДАМЛМ, з дырэктарам Ганнай Запартыкай: ва ўстанове ўжо апрацоўваюць некаторыя матэрыялы са спадчыны нашых пісьменнікаў, якія будуць прапанаваны да друку ў часопісе.

Не спыніцца публікацыя найлепшых твораў і ў рубрыцы «Галасы свету». Дзякуючы працы нашых перакладчыкаў, у наступным годзе многія ўзоры і з класікі, і з сучаснай літаратуры загучаць па-беларуску ўпершыню.

Выданне не абміне ўвагай і 50-гадовы юбілей выдавецтва «Мастацкая літаратура». Звяртаюся да чытачоў і аўтараў: чытайце нашы часопісы, а мы пастараемся адпавядаць вашым запатрабаванням і спадзяванням і адначасова быць у чымсьці нечаканымі.

Вольга РАЦЭВІЧ: «Ёсць што сказаць маладым»

Пэўныя змены, якія ў нас адбыліся, найперш звязаны з імёнамі маладосцеўскіх аўтараў: павялічылася колькасць сталых паэтаў і празаікаў — яны будуць прысутнічаць на старонках часопіса, бо менавіта з «Маладосці» пачыналі свой шлях у літаратуру. Сёння яны — настаўнікі, ім ёсць што сказаць маладым, і гэта важна, бо літаратура — адна вялікая сям'я… Вучыцца, дарэчы, можна незалежна ад узросту, напрыклад, падчас круглых сталоў, што запланаваны ў «Маладосці» з удзелам і маладых, і сталых пісьменнікаў.

Акрамя круглых сталоў на старонках часопіса будуць прысутнічаць і дыскусійныя клубы, бо сёння вельмі важна гаварыць пра тэндэнцыі развіцця маладой літаратуры. Тым больш што многія маладыя аўтары сябе сцвердзілі, але застаюцца незаўважанымі нашымі крытыкамі і чытачамі.

На старонках часопіса запланаваны новыя тэмы, імёны, аўтары, пераважна маладыя, будзем адзначаць юбілеі: і выдавецтва «Мастацкая літаратура», і пісьменнікаў Яўгена Хвалея, Раісы Баравіковай, Георгія Марчука. Акрамя таго, мы супрацоўнічаем з літаб'яднаннямі, шукаем маладых літаратараў: гэта творчыя суполкі ў Горках, Магілёве, і Мінская «Альтанка». Безумоўна, будзем друкаваць пераклады, у асноўным студэнтаў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Чакаюцца цікавыя даследаванні замежнай літаратуры: запланаваны ўжо работы па тэме турэцкай і італьянскай.

Ёсць у нас рубрыка «Анкета» — на наступны год у яе межах прапануем цікавыя тэмы і абмеркаванні. Плануем шэраг інтэрв'ю з супрацоўнікамі выдавецтва, успаміны. Акрамя таго, мы супрацоўнічаем з БДАМЛМ — ужо ёсць дамоўленасць аб публікацыі дзённікавых запісаў Алеся Наўроцкага — яму ў наступным годзе магло б быць 85. Напісаныя адметнай літаратурнай мовай, яны з'яўляюцца споведдзю маладога чалавека з вельмі няпростым лёсам. Ужо займаюцца падрыхтоўкай запісаў да друку.

Наталія КАСЦЮЧЭНКА: «Важна зрабіць акцэнт на духоўным развіцці грамадства»

Галоўнай задачай часопіса «Нёман», як і раней, застаецца фарміраванне дастойнага зместу. Сёння асабліва важна зрабіць акцэнт на духоўным развіцці грамадства. На старонках выдання чытач сустрэне імёны даўно ўпадабаных майстроў слова і малавядомых маладых, але таленавітых аўтараў. Паэзіяй парадуюць Віктар Гардзей, Дар'я Дарошкіна, Таццяна Ляйко, Уладзімір Мазго, Лізавета Палеес, Кацярына Роўда ды іншыя. Сярод празаікаў — Валерый Гапееў, Таццяна Дземідовіч, Алена Папова, Васіль Ткачоў.

Верагодна, цікавым для чытача будзе новы раман Сяргея Трахімёнка «Прынцып слабага звяна», дзе аўтар звяртаецца да падзей мінулага стагоддзя, калі ў Тэхасе падчас перадвыбарчай паездкі быў забіты Прэзідэнт ЗША Джон Кенэдзі, а галоўным падазроным аказаўся Лі Харві Освальд, які ў 1960-я гады жыў у Мінску і працаваў на радыёзаводзе.

У межах праекта «Маладыя перакладчыкі» будуць у друку пераклады студэнтаў МДЛУ з беларускай і іншых моў свету твораў, якія нясуць ідэі міру і гуманізму.

Да 140-годдзя Якуба Коласа парадуе перакладамі Андрэй Цяўлоўскі: даволі нечаканы факт, што паэма «Новая зямля» ніколі не перастваралася па-руску цалкам. Пераклад, які ўжо лічаць класічным, карацейшы ад арыгінала амаль на трэць. На старонках часопіса будуць упершыню апублікаваны тыя часткі твора, якія дагэтуль на рускую мову не перакладаліся.

Чакаюць чытачоў і сустрэчы са знакамітымі публіцыстамі, літаратуразнаўцамі, крытыкамі. Так, тэатральны крытык Таццяна Арлова прадставіць пад вокладкай выдання архіўныя тэксты калегі Лілііі Брандабоўскай, якая нядаўна пайшла з жыцця: рэцэнзіі, тэатральныя партрэты, лісты, нарысы. З іх яскрава відаць постаць Лілііі Брандабоўскай з асаблівым поглядам на тэатральнае і будзённае жыццё. Адна з найцудоўнейшых дэталяляў гэтай публікацыі — пачуццё мовы і стылю.

Не пакіне абыякавым чытача і перапіска пісьменніка і мовазнаўца Міколы Лобана з яго каханай. У свой час ліставанне легла ў аснову пасляваеннай аповесці М. Лобана «Іркуцянка». Чакае і новая рубрыка Юліі Андрэевай «Другое дыханне», дзе будуць абмяркоўвацца пытанні здароўя.

Падрыхтавала Марыя ЯРАШЭВІЧ



Мікола МАЛЯЎКА

Радзіма

Бывала, у вёсцы штодня
Хто-небудзь прывеціць, абдыме:
Жылі бацькі і радня —
Спрыялі мне
На радзіме.

Чужэюць, трацяць давер
Старыя сябры з маладосці,
Ды ёсць да каго і цяпер
Прыехаць з любоўю
У госці.

За корань жыцця на зямлі
Трымаюся сэрцам, вачыма:
У вечнасць бацькі адышлі,
А ты засталася,
Радзіма.

Жывая памяць

Марыі Дзмітрыеўне МІЦКЕВІЧ, жонцы Якуба КОЛАСА

1. Маці

Не цьмела неба ад дыму,
Блакітам цешыла зноў.
Ляцела яна на Радзіму —
У горад свой,
Да сыноў.

Не чула маторнага гулу,
Не бачыла сонца ў акне —
Здавалася, што заснула
Яна вось так,
У труне.

Мінула нашэсця навала,
Зляталіся людзі здаля.
Героям салютавала,
Жывым і мёртвым,
Зямля.

Цяпер бы ў поле, на рэчку,
Пад лесу зялёнага дах.
Жывою кветкаю свечка
Свяцілася
Ў галавах.

Не ў выраі! Не ў адзіноце!
І плакалі дома сыны,
Як быццам на самалёце
Вярнулася маці
З вайны.

2. Валошка

Туліўся хутарок пры лесе.
Віталі маладых у хаце:
Яны прыехалі з Палесся
Сюды, да Коласавай маці.

Жытнёвы красаваў палетак,
І ёй, шчаслівай і прыгожай,
Шаптаў паэт, нарваўшы кветак:
«Я колас, ты — мая валошка».

О колькі разам перажыта
І перацёрта ў лёсу жорнах!
Загінуў сын, гарэла жыта.
Гарэлі кветкі ў жыце чорным.

Вяртала Перамога з выраю,
Ды зноў душу зацьміла горыч.
«Не адцвітай вясной, Марыйка», —
Шаптаў паэт, панікшы поруч.

Я чую іх лірычны голас,
Вядзе на могілкі дарожка,
Дзе не сумуе родны Колас,
Бо з ім і тут яна, Валошка.

3. Бабуля

Яна ў вясёлкавых абновах
Не брала іх, малых, на рукі.
Сюды, на могілкі Вайсковыя,
Прыходзяць пакланіцца ўнукі.

Не зналі ўнукі ліхалецця,
Жывуць у шчырасці і згодзе,
І ў іх саміх сталеюць дзеці —
Нашчадкі ў Коласавым родзе.

Малітвай там, у свеце Божым,
Спрыяе, пэўна, і бабуля,
Таму і даўгалецце кожнаму
Прарочыць шчодрая зязюля.

Бабулю ўявяць,
Дзеда ўспомняць —
Шчаслівых, як на фотаздымках,
І заміраюць каля помнікаў,
Нібыта ў іх зямных абдымках.

Да слёз узрушаць жáльбы стрункі,
А дома, у пакоі ціхім,
Бяруць у рукі падарункі —
Жывыя Коласавы кнігі.

Не чуем уласнага голасу

Анатолю Васільевічу ГРЭКАВУ — колішняму асветніку, культурнаму дзеячу на Стаўбцоўшчыне

Доля зямная
На шчасце скупая,
І нялёгка наперад ісці.
Анатоль Васільевіч,
Як вас не хапае
У нашым жыцці!

Нават тут,
На радзіме Коласа,
Сохнуць духоўныя карані.
Мы не чуем уласнага голасу,
Задыхаемся —
У цішыні.

Сумна было ці весела,
Не стамляліся вы,
Дабрадзей:
На лірычныя святы паэзіі
З цэлага свету
Збіралі людзей.

Цешылі музыка,
Спевы натхнёныя
Варажбой вяселля, журбы —
І русалкі выходзілі з Нёмана,
Тáнчылі воблакі і дубы.

Нам здавалася,
Продкі вярнуліся
Да вытокаў жывой красы:
У сучаснікаў хоры чуліся
Іх адметныя галасы.

Пераемнасці творчай не бачым,
Не адчуваем у нашы дні:
Вашы наступнікі дбаюць
Пра духоўную спадчыну —
У цішыні.

Мова родная
Слёзы хавае
За адчужэння сцяной…
Анатоль Васільевіч,
Як вы трываеце
Там, у вечнасці незямной?..

Сейбіт

Гарбаціўся за плугам на сяўбе,
Выворваў камяні, цягаў у кучы,
Вымольваў у спякоту дождж гаючы.
Пра хлеб ён дбаў не толькі для сябе,
Засеў жытнёвы, бачыў, не слабеў —
І радаваўся, клопатамі змучаны:
Дажынкі вёску песнямі агучаць,
Разгладзяцца маршчынкі на ілбе.

Пабіла градам, паламала жыта,
І сейбіт сам акамянеў нібыта.
За грэх які зацьміла свет стыхія?
Падумаў пра зіму, пусты засек, —
І першы раз пачулі ўсе святыя,
Як ён заплакаў, божы чалавек.

Дзякуй, паштоўка!..

Роднае неба — без сонца і просіні.
Грэе ўспамінаў агонь.
Жоўты лісток,
як паштоўка ад восені,
Падае мне на далонь.

Я разумею пасланне лірычнае:
Гэты лісток і без слоў,
Гэты лісток і без голасу клічнікаў
Гоіць душу, як любоў.

Бабіна лета парадуе, верыцца,
Выйдзеш у сонечны сад.
Дзякуй, паштоўка!..
Яшчэ ён наперадзе,
Наш залаты лістапад.

Яўген БОДРЫКАЎ

Начныя думкі

Зоркамі асвечаны ў цішы,
Думкамі абложаны, як замак,
Не сядзі — бяры хутчэй пішы,
Пабудуй уласны выхад з рамак.

Скінь свае цяжкія кайданы,
Адыдзі ад нормы рэалістаў.
Хопіць разбураючай вайны
З нуднымі мальбамі песімістаў.

Уздымай паўстанне ў галаве,
Зазірні за межы шэрых тыдняў.
Будзь крыху, як конік у траве,
Што жыве без дротаў ды без мытняў.

Будзь сабой, сваім жыві жыццём —
Менавіта так, на гэтым клічнік!
Для цябе цяпер не адкрыццё:
Сам сабе ты цар, а не апрычнік.

* * *

Ну вось ізноў ты дасядзеў да ночы.
Не лёг у ложак, не забыўся сном.
І не сказаць, што ты не спаць ахвочы.
Ты тут сядзіш, але не той, што днём.

З вачэй, здаецца, знялі акуляры —
І свет больш не ружовы стаў зусім.
Сам-насам ты, без сябра і без пары.
У цемры, у цішы ты стаў другім.

Фота Кастуся Дробава.

Ты цалкам для сябе раскрыеш душу,
Дастанеш боль, што еў цябе ўвесь час.
Нырнеш у вір ды выскачыш на сушу,
Смакуючы свой боль чарговы раз.

Ну а пасля, спустошаны, без сілы,
Гадзіны ў тры ты пойдзеш адпачыць,
На ложак спаць, каб сон пабачыць мілы,
Каб боль спыніць і далей проста жыць.

Ты снішся мне…

Ты снішся мне. Амаль што кожнай ноччу
Я бачу вобраз, мілы мне, у сне.
І зноў, і зноў я да цябе там крочу.
Ты снішся мне… Ты чуеш? Снішся мне.

Чарговы раз, падмануты міжволі,
Прачнуся ў адзіноце і журбе,
А позіркам сваім упруся ў столі...
Я зноў не змог прыехаць да цябе.

Міне апошні тыдзень адзіноты,
І мой цягнік праедзе ўсе масты.
Ну а пакуль ад смутку ды самоты
У снах мяне ратуеш ноччу ты.

Ты снішся мне. Як шчасце ці як лекі,
Як самая каханая ў жыцці.
Заплюшчу ноччу зноўку я павекі.
Хутчэй, чарговы тыдзень, праляці!

Пытанне і адказ

Чаму мне Бог цябе такую даў?
І сапраўды, цікавае пытанне.
Каб я начамі доўгімі не спаў,
Стварыўшы верш пра моцнае каханне?

А мабыць, каб я проста стаў мацней
І, вольны час свой спорту прысвяціўшы,
Сярод бясконцай колькасці людзей
Цябе не даў у крыўду, засланіўшы?

Магчыма ж, што ўсё тут наадварот,
І гэта ты — мой моцны абаронца,
Ды ад бяды, што будзе ў цёмны год,
Сваім каханнем выведзеш на сонца!

Чаму мне Бог цябе такую даў?
Адказ адзін: каб ты была са мною.
Я ўдзячны, што аднойчы пакахаў
Цябе сваімі сэрцам і душою!

Паміж кубкам і вуснамі

(з новых запісаў)

Казімір КАМЕЙША

* * *

Лес кліча мяне ў свае шаты ў любую пару і года, і дня. Але любіць ён гасцей самых ранніх. Ды і раніцай іду туды не спяшаючыся, не на самым досвітку, яшчэ да таго, як выганяць пастухі на пашу кароў, ведаючы, што дзень прыходзіць у тую лясную глыб у апошнюю чаргу, уважыўшы спачатку луг ды поле. Нават калі ўжо добра заднее, самыя галоўныя жыхары лесу — дрэвы — жывуць яшчэ ўчарашнім днём. У іх кронах часта яшчэ шапоча ўчарашні дождж, шукаюць сабе паратунку ўчарашнія цені, самі сцяжыны трашчаць яшчэ ўчарашнім суччам, паветра пахне водарам учарашняй смалы. Адны толькі птушкі спяваюць свае песні дню новаму.

І вось прыходзіць разам з сонцам, або і без яго, дзень і адразу налівае табе поўны кубак свежага, чыстага і гаючага настою, і дыханне тваё разам з лесам набывае іншы, нашмат маладзейшы характар. Па ім, учарашнім, можна толькі ўздыхаць, а гэтым, сённяшнім, трэба дыхаць!

* * *

Цяжка ісці насупраць ветру, насупраць сонца. Вецер б'е ў твар і грудзі, прыпыняе хаду, сонца слёзіць і слепіць вочы, змушае азірацца. Добра, калі і з ветрам, і з сонцам — згодай, у адным кірунку. Але такое бывае рэдка. Добра ўсё ж, калі ты ідзеш, калі ёсць дарога. Тады абавязкова недзе прыйдзеш. Ідзеш — значыць жывеш. Нават калі цябе не слухаюцца ногі — ты ўсё роўна ідзеш. Тваю хаду падхопліваюць, за цябе ідуць твае вочы, твае думкі, нават слёзы твае.

Добра, калі ты ідзеш, а думкі дапамагаюць у гэтай хадзе, хай і не падносяць тваю цяжкую валізу, але схіляюць да нейкай уяўнай, але дужа сяброўскай сустрэчы, да ўдачы, знаходкі, нават абдымкаў. Ах, як тады добра ідзецца!..

Дрэнна, калі ты ідзеш і ўвесь час думаеш: «Вось зараз пашанцуе, нехта дагоніць мяне і падвязе. Ну дзе ты там бавішся?..» Дрэнны гэта хадок. Думкі — гэта не яго кампанія. Ён шкадуе свае ногі, але не хоча звяртаць увагі на свае думкі. Трэба хадзіць і насупраць ветру, і насупраць сонца. Нельга толькі хадзіць насупраць часу.

Смешна, але на стале, пад якім я вучыўся некалькі хадзіць, запісваю гэтыя думкі, і яны самі падымаюць мяне: «Ну, ідзі ты, прайдзіся. Вунь сумуюць без цябе дарогі!..»

* * *

Зямляк мой, калі даведаўся, што вайсковую сваю службу я праходзіў у Маскве, расказаў і пра сваё наведванне сталіцы вялікай тады дзяржавы. Прыехаўшы, ён доўга шукаў месца ў гатэлі. Пасялілі яго ў нумар на трох, дзе двое ўжо да яго даўно засяліліся. Калі ён адчыніў пакой, тыя двое адразу юркнулі з галовам пад коўдры. Ён ціха прайшоў да свайго ложка. Пачаў распранацца, адчыніў сваю валізку, доўга ў ёй капаўся. А яны ўсё не высоўвалі галоў з-пад коўдры. Тады ён моцна кашлянуў і падаў свой голас:

— Вы жывыя, людзі? Э-гей!..

Коўдры адхінуліся, і адтуль паказаліся дзве галавы. І ў абедзвюх былі густа перабінтаваны насы.

— Будзем знаёмы. Я — Гіві. А ён — Вано. Не палохайся нас. Мы пасля аперацыі.

Дайшло да земляка, што гэтыя каўказцы з'явіліся сюды раўнаваць праз хірургаў свае тыпова горскія насы. Спачатку хацеў пасароміць новых знаёмых: «Што ж вы псуяце тое, што падаравала вам прырода!» Але стрымаўся. І падумаў сам сабе так: «Можна ў гэтым жыцці памяняць што хочаш, нават нос. Нельга толькі памяняць нюх».

* * *

Дзе і як пішуцца вершы? Чытачам тое бывае цікава. Гэта як у каго. Можна так адказаць на само пытанне. Але, мяркуючы па сабе, пішуцца яны ўсюды, дзе можна і няможна. Я свае пісаў і на ўроках школьных, можа, па гэтай прычыне і меў траякі па геаметрыі, хіміі. У студэнцтве добра пісалася на лекцыях, вядома ж, лекцыях доўгіх і нудных. Мой аднакурснік Э. Зубрыцкі напісаў на лекцыі аднойчы цэлую аповесць. І нават надрукаваў яе потым у часопісе «Маладосць». Пісаў я і ў лесе, і ў дарозе, седзячы ў рэдакцыйным пакоі і на адказным пасяджэнні. Ведаю, што гэтым грашылі і нашы класікі, засядаючы ў парламенцкіх залах. Прызнаваўся ж Максім Танк у сваіх дзённіках, як яны ўтрох — К. Крапіва, А. Куляшоў ды ён сам — на сесіі Вярхоўнага Савета склалі хлёсткую эпіграму на Пятра Глебку.

Казалі, што адзін наш паэт абсталяваў сабе кабінет на кроне дрэва. Змайстраваў там гэткую буслянку, дзе былі і стол, і крэсла. На стале тым ён клаў стажок паперы, а каля яго пачак «Беламору» і ставіў пляшку віна. Пад колцы сіняга дыму і чарку з яблыкам ён і муштраваў тую самую гаротніцу-рыфму, дадаючы гонару і высакасці не столькі паэзіі, колькі сваёй выдумцы. Не думаю, што чытач зацікавіцца тваім вершам толькі таму, што ты пісаў яго на кроне бярозы ці ў салоне самалёта. Сам я даўно пераканаўся ў тым, што рабочы кабінет паэта — у ім самім.

* * *

Было, што пісьменнікі на нейкай там сваёй «збюрцы» жартавалі:

— Ты глянь, колькі ў нас Іванаў развялося ў пісьменніцкім даведніку. Нават у апараце СП ажно тры сакратары Іваны…

— Не тры, а два, — папраўлялі яго, — бо трэці ж не Іван, а Янка…

Смяяліся… Тады і сапраўды не сказаць каб многія, але Іваны пачалі псеўданіміцца пад Янкаў. Адзін Скрыган, улавіўшы гэта, назваўся Янам. Працуючы з Юрасём Свіркам на Беларускім радыё, мы раілі і нашаму калегу Івану Калесніку назвацца Янкам Калеснікам.

— Не хачу, — буркнуў той незадаволена. Бо атрымаецца збег двух ка. І надта смешна будзе гучаць.

— Ёсць жа і другія варыянты, — казалі мы. — Янук, Янак, Януш.

— А што, хіба дрэнна Іван Калеснік! — пачынаў злавацца наш калега.

— А ты ўважліва прачытай сваё літаратурнае імя. Уважліва і прыдзірліва, — не здаваўся Свірка. Чытаецца вунь як — Іванка Леснік. Можа, і бяры сабе такі псеўданім…

Узлаваўся наш Іван Іванавіч дарэшты. Падхапіўся з-за стала і пабег з рэдакцыі…

* * *

— Кім гэта Стась там, у горадзе, робіць, не ведаеш? Бо, кажуць, грошы добрыя атрымлівае…

— Чаму ж, ведаю. Гэным, бармэнам робіць…

— А што гэта за работа такая, патлумач мне.

— Ды гарэлкі ў чаркі не далівае. Камбінуе, значыць…

— Бачыш ты, у дзеда пайшоў. І той быў скупярда. Але каб на гэтым грошы зарабляць…

* * *

Адсадзіць…

Выплыла раптам з памяці і гэтае слова. І выплыла тады, калі мы ўчацвярых на гаманкой вясковай лавачцы згадвалі аднаго тутэйшага «боўдзілу», які сам ужо ў добрых гадах, а жыве ўсё яшчэ на сціплую матчыну пенсію.

— Адсадзіць яго даўно пара! — сказаў нечакана самы старэйшы.

Адсадзіць у сялянскім жыцці азначае адлучыць малое цялё ад маткі і перавесці яго на самастойнае кармленне.

— Пасадзіць яго мала, п'яніцу і гультая, — падхапіў адразу маладзейшы. А яшчэ за яго маладзейшы нібыта і запярэчыў:

— Ну што вы ўжо так на чалавека!.. Ён жа працуе…

— Дзе ён працуе? Палец аб палец не выцяў ніколі, — абураўся яшчэ адзін з нас.

— Ды ў ПМК працуе.

Двое пераглянуліся, а я засмяяўся, бо ведаў, што абрэвіятура ПМК (перасоўна-механізаваная калона) прачытваецца цяпер і гэтак: пакуль мама корміць.

* * *

Магчыма, зачаста выкарыстоўваю я слова «памяць». Але гэтае слова не столькі любімае, колькі балючае. Думаю, так і ў кожнага. Чым больш чалавек жыве на гэтым свеце, тым больш ён жыве сваёй памяццю. І параўнанні сабе, і падтрымку ён бярэ толькі адтуль.

* * *

Некалі і гэты пярсцёнак пакіне свой палец, адразу і забудзецца, да чаго ён толькі ні дакранаўся. Няма, на жаль, у пярсцёнка таго адчування, што было ў самога пальца. А блішчэць — гэта ў яго атрымліваецца добра.

* * *

Прычэпшчык

— А ведаеш, кім быў твой прадзед? — пытаюць часам у малога праўнука вяскоўцы. А потым і кажуць яму, што быў ён прычэпшчыкам. Той глядзіць з-пад ілба і не разумее, жартуюць з ім ці не. Была некалі і такая спецыяльнасць. З'явілася яна адразу, як і з'явіўся гусенічны трактар. Я добра памятаю той пасляваенны час. Ніякай гідраўлікі тады яшчэ не існавала, і сталёвыя плугі чапляліся да гусенічніка з дапамогай вядомага «шворана». А кіраваў імі прычэпшчык. Было ў яго на тых плугах сваё жалезнае крэсла, нейкія там прыстасаванні, з дапамогай якіх ён і падымаў, і апускаў іх. Колькі разоў і мне шанцавала пасядзець у тым крэсле. Халаднаватае яно, калі без нейкай падкладкі ды ў халодную пару.

У гэтай неадчэпнай пары — трактарыст і прычэпшчык — галоўным быў ён, трактарыст. А прычэпшчык так сабе, нейкі нібыта прыхвасцень. На вечарынках дзяўчаты жартавалі: «Ат, прычапіўся гэны прычэпшчык, як смала тая».

А праца ў прычэпшчыка была і не такая лёгкая. Колькі было таго заробку, а пылу за гады сваёй палявой працы наглытаешся ўдосталь.

— Абыдземся і без яго, прычэпшчыка! — сказаў урэшце і зрабіў сваё час. Хоць трактар і прычэп пакінуў, падладзіўшы яго пад самога сябе. У часе і павінна быць усё падобнае на сам час.

* * *

Крыху граматыкі. Серп роду мужчынскага, а прылада чыста жаночая, а каса, наадварот, належыць да жаночага роду, а начынне чыста мужчынскае. Хоць мне даводзілася бачыць у жыцці з касой жанок, а з сярпом мужчын. Усюды бываюць свае выключэнні. Але я не раблю тут нейкіх намёкаў мовазнаўцам. Які гэта рэдактар дадумаецца правіць тое, што стварылі ўтраіх разам: жыццё, народ і час?!

* * *

Марудна цягнецца летні дзень, бо не спяшаецца само сонца, заглядаючы па чарзе ў кожнае акно хаты, пакуль не спыніцца на чацвёртым. Тады можна ўжо чакаць і добрага цяню, і халадку, і спакою, якіх не хапала днём. У чацвёртым акне пачынаецца вечар. А потым і ноч… Яна ўжо недзе там, за тыльнай сцяной.

Праз чатыры акны — дзяцінства, юнацтва, сталасць і старасць — рухаецца і жыццё чалавечае. А там, за чацвёртым, — толькі сцяна…

* * *

Глядзець вочы ў вочы, не адводзячы іх, — смеласць. Мне гэта заўсёды даецца цяжка. Наш пушчанец супакоіў жартам:

— Добра гэта — вочы ў вочы,
Але добра толькі ўночы!..

* * *

Суседка па лецішчы прыязджае на сваю сядзібу раз на тыдзень, у канцы яго. Калі няма яе самой, з-за старога ўжо плоту зыркаюць на мяне ва ўсе свае чырвоныя вочы расквітнелыя гардукі (цюльпаны). Надта многа кветак! Але яны цвітуць самі для сябе. І глядзяць іх вочы праз плот на мяне, а перайсці не могуць. Плот!.. Праз акно хачу іх супакоіць, што я ўсё бачу і радуюся, што яны хочуць цвісці не толькі для сябе ды крыху для маёй суседкі, але і для мяне таксама. Добра, калі ёсць паразуменне з кветкамі…

* * *

Новая пасада адразу змяніла чалавека. Цяпер ён і ў лазню вясковую саромеўся паказвацца, ездзіў недзе «на раён».

— А хто ж яму цяпер спіну будзе церці? — пыталіся здзіўлёныя вяскоўцы.

— Знойдзецца і на яго свая вяхотка (мачалка), — казаў нехта.

* * *

І так спрытна пажартавала гэтая жанчына-жывёлавод:

— Кожную сваю карову я ведаю па вымені...

* * *

— Сёння я не паважаю сябе! — скардзіцца дзядуля сваёй дачцэ.

— Чаму гэта, дзядуля? — здзіўляецца тая.

— Ды ўчора зноў паверыў гэнаму… Лёніку. А Лёніку давяраць — сябе не паважаць…

* * *

Вечаровае пісанне амаль заўсёды само і спыняла мяне. Бо трэба ўвесь час пісаць праз цень сваёй рукі. Уключаеш настольную лямпу, кладзеш аркушык паперы, пачынаеш пісаць, а на перарэз табе чорны цень тваёй рукі. Адразу крэсляцца думкі, і ты адкладваеш сваю пісаніну ўбок, бярэшся за кнігу. Лепш ужо чытанне. Не ведаю, як у каго, а ў мяне гэтак…

* * *

Мужчыны часта не саромеюцца піць з аднае чаркі, смактаць адну і тую ж цыгарку, а то і дакурваць ужо дакураныя некім «бычкі», але ці адважыцца хто з іх смактаць некім смактаную цукерку? Такога я не бачыў. Але ж чуў…

* * *

Умеў гэты пушчанец досціпам сваім прыпыніць любога гаваруна-пустамалота.

— Ты ці не з Плешчаніц сам, — казаў ён нават спакойна.

— Чаму? — не разумеў той.

— Ды плешчаш абы што…

* * *

З агаворкай

— Бачыў я і лятучую змяю, але ляцела яна ў дзюбе бусла, бачыў і лятаючую талерку, але ляцела яна з рук п'янага дзецюка ў рэстаране…

Бачыў я і яшчэ не такія цуды, але ўсё толькі з агаворкай…

* * *

Разам з хвілінамі, днямі, а потым і гадамі — усё сыходзіць, аддаляецца, пакідаючы толькі сумнае шкадаванне. І каму я сёння паскарджуся, што маё далёкае «нештачка» было куды пяшчотнейшым і дарагім, чым сённяшняе «нешта»?..

«Яны ж, на мой погляд, заслугоўваюць большага»

Адкрыццём часовай экспазіцыі пад назвай «У той песні, шырокай, як свет…», прымеркаванай да 100-годдзя зборніка алегарычных апавяданняў «Казкі жыцця», адсвяткаваў дзень нараджэння народнага паэта Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. На выстаўцы прадстаўлены выданні «Казак жыцця» розных часоў, пераклады асобных алегарычных апавяданняў на іншыя мовы свету, а таксама ілюстрацыі да казак з прыватнай калекцыі беларускай мастачкі Людмілы Пятруль.

Мастачка Людміла Пятруль.

«Если бы я дожил до 15 сентября текущего года, я отмечал бы пятидесятилетие литературной деятельности. На всякий случай собрал «Сказки жизни», написанные за годы 1908—1956. А ведь их в России не знают, да и здесь, в Белоруссии, их знает лишь несколько человек. Они же, на мой взгляд, заслуживают большего», — так напісаў Якуб Колас свайму сябру і перакладчыку С. Гарадзецкаму 13 мая 1956 года.

Выданні розных гадоў.

У літаратурнай спадчыне Якуба Коласа «Казкі жыцця» займаюць асаблівае месца. Алегарычныя апавяданні Якуб Колас пісаў з 1906 года і да апошніх дзён свайго жыцця, аднак з вялікім перапынкам у 1930—1940-я гады. Гэта быў адзін з любімых жанраў паэта. Ён — вынік асэнсавання творцам гістарычных з'яў, спроба выявіць шматлікія філасофскія і этычныя праблемы. Першае апавяданне «Дудар» выйшла ў 1906 годзе ў газеце «Наша Ніва», апошняе — «Страказа» — было напісана ў 1956-м. Увесь цыкл алегарычных апавяданняў аб'ядноўвае 32 казкі. Паэт называў іх адзіным творам.

Спачатку казкі друкаваліся паасобку ў розных перыядычных выданнях — газетах «Наша Ніва», «Вольная Беларусь», зборніках «Родныя з'явы», «Беларускі каляндар». Першае выданне «Казак жыцця» Якуба Коласа асобнай кнігай з'явілася ў 1921 годзе, яно выйшла ў горадзе Коўне.

У прадмове да кнігі Якуба Коласа «Казкі жыцця», якую музей песняра падрыхтаваў да 100-годдзя першага выдання твора, унучка паэта Вера Данііпаўна Міцкевіч адзначыла: *«Алегарычныя апавяданні, якія Якуб Колас пісаў на працягу паўстагоддзя і змясціў пад адной вокладкай, ёсць квінтэсэнцыя жыццёвай мудрасці, філасофскай думкі, вобразнасці, фантастычнасці і павучальнасці»*. Для паэта «Казкі жыцця» — не проста збор асобных казак, а адзіны твор, яго спроба асэнсаваць адвечныя філасофскія і этычныя праблемы. Так, казка «Зло — не заўсёды зло» ўзнімае праблемы дабра і зла, казка «Супраць вады» — пытанні волі, праўды і свабоды. У казцы «Дудар», якая доўгі час была забаронена, Якуб Колас адстойваў беларускую мову, апавяданне «Гусі» прысвечана вяртанню пісьменніка на Радзіму пасля доўгіх гадоў разлукі з роднай старонкай падчас Першай сусветнай вайны. Зборнік змяшчае і некалькі казак-прысвячэнняў. Так, казка «Ноч, калі папараць цвіце» прысвечана Янку Купалу, была напісана на дваццацігоддзе яго літаратурнай дзейнасці. У казцы «Кучаравае дрэва» Якуб Колас прадставіў «алегарычны партрэт пісьменніка» Змітрака Бядулі, з якім сябраваў з 1906 года, калі яны разам працавалі ў рэдакцыі газеты «Наша Ніва». Пісьменнікаў звязвалі доўгія гады сяброўства і сумеснай творчасці.

Алегарычнае апавяданне «Над прасторамі зямлі» прысвечана Цішку Гартнаму. Гэта апошні твор з цыкла, які быў напісаны Якубам Коласам у даваенны час. Казка прымяркоўвалася да дваццацігоддзя літаратурнай дзейнасці пісьменніка, якое адзначалася 15 снежня 1928 года. Пасля таго, як казка была апублікавана, яна трапіла ў лік твораў, якія доўга не друкаваліся. М. Мушынскі меркаваў, што прычына была ў тым, што Цішка Гартны, якому твор прысвечаны, у 1955 годзе быў толькі часткова рэабілітаваны. Поўная палітычная рэабілітацыя адбылася ў 1988 годзе. Вядома ж, Якуб Колас мог выратаваць твор, зняўшы прысвячэнне, але пайсці такім шляхам паэт не захацеў. У Збор твораў казка «Над прасторамі зямлі» ўпершыню ўвайшла толькі ў 1962 годзе.

У зборніку ёсць і яшчэ адна вельмі цікавая казка «Як птушкі дуб ратавалі». Малодшы сын Якуба Коласа Міхась Міцкевіч лічыў, што ў вобразе дуба — любімага дрэва паэта — Якуб Колас паказаў сябе. У вобразе птушак, якія так стараліся палепшыць стан здароўя дуба, зашыфраваны рэальныя асобы: крумкач і дзяцел — дактары Якуба Коласа Б. Трусевіч і Д. Маркаў, галубкі — сыны паэта, сарока і сойка — нявесткі песняра.

Напрыканцы жыцця Якуб Колас рыхтаваў «Казкі жыцця» да перавыдання. Асобнай кнігай пры жыцці паэта апошні раз яны выходзілі толькі ў 1928 годзе. Кніга 1928 года з праўкамі аўтара і да сённяшняга часу ляжыць у стале пісьменніка ў яго рабочым кабінеце.

Аўтар значна перапрацаваў твор — зрабіў новы змест кнігі, напісаў новыя казкі. Дзякуючы таму, што Якуб Колас працаваў над зборнікам у апошнія гады свайго жыцця, у фондах музея захаваліся рукапісы і машынапісы казак, якія прадстаўлены на часовай экспазіцыі.

Ілюстрацыя да апавядання «Адзінокі курган».

У дзень смерці Якуб Колас чарговы раз пісаў С. Гарадзецкаму пра набалелае, з глубокім смуткам паведамляў аб пераносе выдання кнігі «Казак жыцця» на наступны год. На жаль, у наступным годзе зборнік алегарычных апавяданняў, над якім так старанна працаваў паэт, так і не выйшаў, ён пабачыў свет толькі ў 1960 годзе, праз чатыры гады пасля смерці паэта.

Шмат іншых звестак, што датычаць жыцця і творчасці народнага пісьменніка, можна знайсці ў матэрыялах выстаўкі, якая працуе да канца лістапада.

Васіліна МІЦКЕВІЧ,
галоўны захавальнік фондаў
Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа

Фота Кастуся ДРОБАВА

І застацца жанчынай...

У Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь у рамках супрацоўніцтва ўстановы з Ізраільскім культурным цэнтрам «Націў», што дзейнічае пры Пасольстве Ізраіля, пачаў работу новы выставачны праект «Праміні святла. Лёс жанчыны ў гады Халакосту». Фотаэкспазіцыя, якая працуе да 1 снежня, падрыхтавана супрацоўнікамі мемарыяльнага комплексу гісторыі Халакосту «Яд ва-Шэм».



Калаж Святланы Таргонскай.

На адкрыцці выстаўкі, прысвечанай гераізму яўрэйскіх жанчын, прысутнічалі высокапастаўленыя асобы — прадстаўнікі Ізраіля. Мерапрыемства наведалі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Алекс Гольдман-Шайман, а таксама іншыя прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса і яўрэйскіх арганізацый.

Экспазіцыя падзелена на дзевяць тэматычных блокаў, звязаных з цяжкасцямі жыцця жанчын у гады Халакосту: каханне, мацярынства, аказанне дапамогі, захаванне жаноцкасці, супраціўленне і выратаванне, сяброўства, вера, клопат пра харчаванне, творчасць. Разам яны дэманструюць увесь маштаб трагедыі.

Канцэнтруючыся на лёсе яўрэйскіх жанчын у гады Халакосту, фотападборка ўслаўляе іх выбар, душэўную стойкасць, сілу супраціўлення злу і жорсткасці. Нават у тыя змрочныя часіны ў сэрцах людзей заставалася месца дабру, надзеі і святлу. Гэта шукалі і знаходзілі ў сабе яўрэйскія жанчыны ва ўмовах, якія супярэчаць уяўленням пра чалавечнасць.

Мікіта ШЧАРБАКОЎ

Юбіляры-творцы, юбіляры-кнігі

Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага заўсёды вылучалася цікавымі ініцыятывамі, скіраванымі на пашырэнне бібліятэчнай і ўвогуле асветніцкай прасторы. Адкрыйце, напрыклад, «Каляндар знамянальных і памятных дат на 2022 год», які толькі што падрыхтавалі берасцейцы.

Складальнікі — супрацоўнікі навукова-метадычнага аддзела гэтай кніжніцы А. Кузьміна, А. Пастыка. Рэдактарам выступіла намеснік дырэктара Л. Кароль. Адказны за выпуск — дырэктар абласной бібліятэкі А. Стрыжэвіч.

У календары — наступныя раздзелы: «Даты беларускага і краязнаўчага календара»; «Даты расійскага і замежнага календара»; «Кнігі-юбіляры».

Звернемся спачатку да тэмы пра кнігі, якія адзначаць той ці іншы юбілей з часу выдання. І пачатак, трэба заўважыць, даволі цікавы. У 2022 годзе — 1595 гадоў з дня нараджэння твора Аўрэлія Аўгусціна Блажэннага «Пра град Божы» (427). 825 гадоў з часу напісання паэмы «Сем прыгажунь» Гянджаві Нізамі. «Бедная Ліза» М. Карамзіна надрукавана ў часопісе 230 гадоў таму — у 1792-м.

Сярод кніг-юбіляраў — творы А. Пушкіна, М. Гогаля, М. Лермантава, І. Ганчарова, Л. Талстога, І. Тургенева, М. Салтыкова-Шчадрына, Ф. Дастаеўскага. 100 гадоў спаўняецца аповесці-феерыі А. Грына «Пунсовыя ветразі», «Майдадыру» К. Чукоўскага.

А якія ж даты краязнаўчага характару аказаліся ў полі зроку берасцейскіх бібліятэкараў? У 2022 годзе — 925 гадоў з часу першага згадвання Пінска ў летапісах (1097); 735 гадоў — першай згадкі Кобрына ў Іпацьеўскім летапісе (1287); 570 гадоў — першага ўпамінання Драгічына ў пісьмовых крыніцах (1452). Юбілеі адзначаць Бяроза, Лагішын, Ружаны, Пружаны.

Што датычыць асоб, то ў студзені 2022-га будзе 75 гадоў ураджэнцу Давыд-Гарадка, пісьменніку Георгію Марчуку, 60 гадоў — скульптару Аляксандру Дранцу (нарадзіўся на Століншчыне). У лютым — 70 гадоў мастаку-манументалісту Уладзіміру Крываблоцкаму (месца нараджэння — Пружанскі раён), 70 гадоў — пісьменніцы Ніне Гарагляд (нарадзілася ў Пінскім раёне). У сакавіку — 75 гадоў вядомаму беларускаму журналісту Леаніду Екелю, выхадцу з Івацэвіцкага раёна.

Не забыліся берасцейскія бібліятэкары пра юбілеі тых пісьменнікаў, асветнікаў, дзеячаў мастацтва, вучоных, хто даўно пайшоў з жыцця. У 2022 годзе — 130 гадоў з дня нараджэння паэта Альбіна-Міхаіла Дзяконскага (ураджэнец Жабінкаўскага раёна), 140 гадоў з дня нараджэння драматурга, рэжысёра, акцёра Уладзіслава Галубка (з'явіўся на свет у Баранавіцкім раёне), 115 гадоў з дня нараджэння мастацтвазнаўцы Алены Аладавай. Адзначаны іншыя цікавыя асобы, якія пакінулі свой след у айчыннай гісторыі.

Адметна і тое, што па-за ўвагай складальнікаў не засталіся краязнаўцы Берасцейшчыны, Беларусі. Гаворка пра юбілеі Льва Коласава (1932—2021), Рамана Гашкевіча (1892—1962), Баляслава Брэжгі (1887—1957), Паўла Баброўскага (1832—1905), Міхася Мялешкі (1892—1941).

«Каляндар знамянальных і памятных дат на 2022 год», падрыхтаваны ў папяровым і электронным фарматах, — безумоўна, — добры дапаможнік для правядзення асветніцкай, краязнаўчай працы. Зразумела, найперш на Берасцейшчыне. За гэта застаецца толькі падзякаваць калектыву Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага.

Мікола БЕРЛЕЖ

Так кажуць на Рагачоўшчыне

Журналіста і пісьменніка Міхася Кавалёва з Гомельшчыны (выступае ў друку з мастацкімі творамі, у асноўным у жанрах сатыры і гумару, пад псеўданімам Міхась Сліва) добра ведаюць чытачы часопіса «Вожык», газеты «Літаратура і мастацтва». Аўтар многіх кніг адзначаны рознымі літаратурнымі прэміямі. А вось кніга «Роднымі сцяжынкамі» адкрыла яшчэ адну якасць літаратара: увішны і ўважлівы творца, Міхась Сліва выдатна адчувае роднае слова.

У гэтым пераконвае раздзел са згаданай кнігі — «Так кажуць на Рагачоўшчыне». Зазірнём на яго старонкі: «Стары кажа на глум, а ты бяры на вум»; «Хоць хамут без лямца, затое дуга з кальцом»; «Адзін з'еш хоць і вала — адна хвала»; «Не хваліся ідучы на кірмаш, а з кірмашу»; «Дзе гора ні хадзіла, а да вахлака нанач»; «Пад усе бочкі шпунт»; «Пашануй адзежынку дома, а яна цябе — у людзях»; «Госць бывае траякі. У першы дзень — золата, на другі — серабро, а на трэці — медзь: збірайся і дадому едзь!»; «З вялікай хмары малы дождж»; «Не абувай ката ў лапці!»; «Што людзям, тое і мне»; «З-за паляжання няма калі і пасядзець»; «Застаўся на моры без вясла».

Трапныя слоўцы, вобразныя фразеалагічныя выразы ўражваюць часам настолькі, што, здаецца, трапляеш у пявучы, напоўнены адмысловымі словамі-вобразамі, свет. А пачатак гэтых моўных вандровак сам пісьменнік тлумачыць наступным чынам: «…вёска мая і яе наваколле — найпрыгажэйшы куток на краі Рагачоўшчыны, на мяжы з Буда-Кашалёўскім раёнам Гомельскай вобласці. Бацькі мае працавалі ў сельскай гаспадарцы. Бацька Мітрафан Фёдаравіч любіў чытаць казкі ўслых, а ў маці Марыі Сідараўны была вобразная, сакавітая мова, багатая народнымі прыказкамі, прымаўкамі, крылатымі выразамі. Многія з іх я цяпер успамінаю і запісваю пад рубрыкай "Так кажуць на Рагачоўшчыне"…»

«У сабакі вочы пазычыў»; «Не дзіва, што ён такі мудры»; «Гэты хлеб аддадзёны!»; «Яе і шыла брэе, а мая і брытва не бярэ»; «І ў марац адмарозіш палец»; «Каму што, а мельніку — вецер»; «Не да парасят, калі свінню смаляць»; «Калі шанцуе, то і Халімон танцуе». Процьмай знаходак падаецца слоўнік «Так кажуць на Рагачоўшчыне». Зразумела, ствараўся, запісваўся ён не адзін дзень. Пэўна ж, з часам Міхась Сліва зробіць з гэтых і сёння ўжо досыць багатых запісаў асобную кнігу. Не праміне яе!

Сяргей ШЫЧКО

Ці можа «ўцячы» вада?

Міжмоўная інтэрферэнцыя ў білінгвальным грамадстве пранізвае ўсе сферы яго вербальнага ўзаемадзеяння, і на гэтую асаблівасць рэдактарам варта звяртаць асаблівую ўвагу. Любыя, здавалася б, невялікія, нюансы значэння слова могуць выклікаць непрадбачаныя сэнсавыя прырашчэнні ў выказванні і змену дакладнага ўспрымання пачутай або прачытанай фразы.

Адметнасць беларускай прыстаўкі *ў-* (*у-*) у яе шматзначнасці. Найбольш распаўсюджанае значэнне: далучаючыся да дзеясловаў, *у-* паказвае накіраванасць дзеяння ўнутр прадмета або асяроддзя: «Ледзь пратаптаная сцежка *ўвяла* яго ў стары хвойнік» (Кузьма Чорны); «Колькі за гадзіну лекаў Лёднік *уліў* у старога — Пранціш стаміўся лічыць» (Людміла Рублеўская); «Дарога *ўсунулася* ў густы, абсыпаны снегам, нізкі з берага хвойнік» (Вячаслаў Адамчык). Адзначанае значэнне беларускай прыстаўкі антанімічнае адпаведнай рускай: *уехаў — въехал* і *паехаў, з'ехаў — уехал*.

Што да дзеяслова *ўцячы*/*уцякаць*, то і ў гэтым выпадку прысутнічае прыстаўка *ў-* з адзначаным значэннем (не блытаць з амонімам, які мае значэнне *збегчы*/*збягаць* і не мае прыстаўкі: *уцяк-а-ць*). Тлумачальныя слоўнікі падаюць толькі адно значэнне: «Упадаць (пра раку, ручай і пад.)»: «Там, дзе Дубравенка *ўцякае* ў Дняпро, яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя былі курганы…» (Юрка Віцьбіч). Іншыя значэнні разгледанага дзеяслова не прыводзяцца, відаць, таму, што амаль паўсюль выкарыстоўваецца яго сінонім *уліцца*/*улівацца*: «Штось прыемнае і радаснае *ўлівалася* яму ў душу ад гэтых новых малюнкаў і ад гэтага размашыстага бегу машыны» (Якуб Колас); «Кроў урача *ўлілася* ў жылы раненага, каб напоўніць страчаную ім кроў і прынесці новыя сілы для змагання са смерцю» (Іван Шамякін). Хоць, па шчырасці, сканструяваць выказванне можна і з дзеясловам *уцячы*: «Дастаткова вады *ўцякло* ў бочку са шланга».

Аднак «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (1980) падае фразеалагізм «многа вады працякло (уцякло)» са значэннем «многа прайшло часу, змен». Менавіта ў гэтым выпадку як быццам дапускаецца магчымасць выкарыстання дзеяслова *ўцякло* з нехарактэрным для яго значэннем: вада ж у рацэ, як і час, не *ўцякае*, а *цячэ*, *працякае*, напрыклад: «Многа бурнай вады *працякло* з таго часу» (Янка Брыль); «Іх можна знайсці ў першай кнізе, і хоць з тае пары, як кажуць, вады *працякло* нямала, ды зноў яны прыходзяць на памяць у сувязі з нашай новай рэальнасцю» (Навум Гальпяровіч). А вядомы руплівец на ніве роднай мовы Іван Лепешаў прыводзіць у сваім фразеалагічным слоўніку выраз «*шмат*, *многа*, *нямала*, *колькі*, *столькі* ВАДЫ СПЛЫЛО (СПЛЫВЕ)», і зноў майстры беларускага слова пацвярджаюць выбар навукоўца: «Браткa ты мой, колькі вады *сплыло*!..» (Уладзімір Караткевіч); «Бог ты мой, колькі гадоў прайшло, колькі вады *сплыло* з часоў таго катка!» (Алена Васілевіч) і інш.

Найперш менавіта нефразеалагічнае ўжыванне *ўцячы*/*уцякаць* выклікае прыкрыя памылкі: «З таго часу ўжо нямала вады ~~ўцякло~~ [працякло] па Бярэзіне, і стан вежы ад гэтага, натуральна, ніяк не палепшыўся»; «Шмат вады ~~ўцякло~~ [працякло] і ў рацэ Ведзьме, шмат пакаленняў прайшлі ў гэтых мясцінах свой зямны шлях»; «Відаць, шмат вады ~~ўцякло~~ [працякло] з таго часу ў Прыпяці…» Але і ў складзе фразеалагізма дзеяслоў не змяняе значэння прыстаўкі *ў-* (*у-*), таму лагічна выкарыстоўваць *працякло* або *сплыло*. Не выключана, што калі б рэдактары прапанавалі замену, то ў наступных двух сказах пісьменнікі згадзіліся б з пераканаўчай матывацыі: «Многа вады *ўцякло* з таго часу. Шмат пабачылі за стагоддзе Яскавічы»; «Колькі вады *ўцякло* з таго часу, як гетманіч Орлік дакладваў нам аб перамовах нашага пасла ў Стамбуле…» Але тут ужо стаіць пытанне пра моўную кампетэнцыю рэдактара.

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ

Літаратура і мастацтва № 45 12 лістапада 2021 ЛіМ

Шлях узнёслай душы

Мастак Аркадзь Астаповіч пражыў кароткае, але напоўненае творчасцю жыццё. Пра яго вядома не вельмі шмат — хіба толькі тое, што расказала за сваё амаль векавое жыццё сястра, таксама мастачка Зінаіда Астаповіч-Бачарова. А між тым работы майстра ўваходзяць у залаты фонд беларускай графікі 1920—1930-х гадоў. Нядаўна асноўны захавальнік спадчыны Аркадзя Астаповіча Нацыянальны мастацкі музей Беларусі адкрыў выстаўку да 125-годдзя з дня нараджэння мастака, дзе прадставіў як эталонныя работы, так і графічныя аркушы, якія экспануюцца рэдка. Сёння ў калекцыі гэтай скарбніцы знаходзіцца больш як 200 твораў аўтара міжваеннага перыяду.



Аўтапартрэт, 1940 г.

Аркадзь Астаповіч нарадзіўся ў Мінску ў 1896 годзе. Бацька, калежскі сакратар, а пазней тытулярны саветнік, Антон Астаповіч выкладаў у гарадскім чатырохкласным вучылішчы. Ад гэтага перыяду захавалася фатаграфія маленькіх Аркадзя і Зіны, зробленая на Захар'еўскай вуліцы (сёння праспект Незалежнасці). У 1900 годзе Астаповічы пакінулі Мінск (Аркадзь вернецца ў 1929-м) і да пачатку Першай сусветнай вайны жылі спачатку ў Рэчыцы, а пазней у Гродне, куды Антон Астаповіч пераехаў, каб даць дзецям прыстойную гімназічную адукацыю. Гродзенскі перыяд стаў адным з самых спрыяльных у жыцці Аркадзя і Зінаіды. Менавіта тут яны пачалі маляваць. Вядома, што да таго часу ў родзе Астаповічаў не было прафесійных мастакоў.

Аркадзь усе школьныя гады лічыўся найлепшым вучнем і ў 1914-м скончыў гродзенскую гімназію з залатым медалём. У гэтым жа годзе, пасля смерці бацькі, сям'я Астаповічаў пераязджае ў Пецярбург (Петраград), дзе юныя брат і сястра ў 1915-м паступаюць у Малявальную школу пры Імператарскім таварыстве заахвочвання мастацтваў і вучацца ў адных і тых жа настаўнікаў — Івана Білібіна, Паўла Навумава, Альфрэда Эберлінга… Да таго ж Аркадзь Астаповіч атрымлівае адукацыю ў Політэхнічным інстытуце на караблебудаўнічым аддзяленні.

Натуральна, у гэтыя гады іх надзвычай прываблівалі музеі і галерэі. «Асабліва прыцягвалі выстаўкі "Свету мастацтва". Там выстаўляліся вельмі цікавыя мастакі: Мітрохін, Лансэрэ, Білібін, Нарбут, Сомаў, Кустодзіеў, Астравумава-Лебедзева, — успамінала Зінаіда Астаповіч-Бачарова. — Брат быў вельмі эрудзіраваным і ў галіне выяўленчага мастацтва, і ў галіне музыкі, літаратуры, паэзіі. З ім было цікава, зносіны з ім узбагачалі. З мастакоў любіў Левітана, шматлікіх з пералічаных мною вышэй графікаў і, вядома, вельмі шматлікіх іншых і старых, і новых майстроў…» Пасля 1916 года шляхі Аркадзя і Зінаіды перасякаліся толькі часам: у Навасёлках пад Мінскам, у Маскве і Ленінградзе.

У гады Першай сусветнай вайны ён служыў у сапёрным батальёне. З 1918 да 1922-га праходзіў службу ў Чырвонай арміі, а ў 1920—1922 гадах займаўся ў малявальнай школе ў Харкаве. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся на радзіму бацькі ў Мінскую губерню, дзе ўзяў шлюб са стрыечнай сястрой, вясковай настаўніцай Нінай Якубовіч. З пункту гледжання большасці даследчыкаў творчасці Аркадзя Астаповіча і на думку яго сястры, час знаходжання Аркадзя Астаповіча ў Навасёлках (а гэта перыяд да 1929 года) з'яўляецца самым плённым. Тут ён пачаў займацца лінагравюрай, перапрацоўваў раней назапашаны матэрыял, рабіў натурныя замалёўкі. Большасць работ — прысвячэнне беларускай вёсцы, асноўны жанр — пейзаж. Выстаўляўся на першых усебеларускіх выстаўках. І ўсе гэтыя гады ў вёсцы, а пазней і ў горадзе працаваў настаўнікам матэматыкі, чарчэння і малявання. Школа ў Навасёлках існуе дагэтуль, але ад той захаваўся толькі падмурак. Стары будынак і дом Астаповічаў побач з ёю згарэлі ў час вайны.

У 1929 годзе Аркадзь Астаповіч вярнуўся ў Мінск і настаўнічаў. Супрацоўнічаў з беларускімі выданнямі, ілюстраваў дзіцячы часопіс «Іскры Ільіча» (1940) і мастацкую літаратуру (напрыклад, твор «Рабінзон Круза» Д. Дэфо, 1937). У 1938 годзе творцу і педагога арыштавалі па даносе. Чатыры месяцы ён правёў у магілёўскай турме, але быў вызвалены пасля ліквідацыі «яжоўшчыны». І ўсё ж лёс не пашкадаваў мастака.

Жыццё Аркадзя абарвалася пад Арлом у першыя месяцы вайны, на якую ён пайшоў добраахвотнікам. У лістападзе 1941 года Зінаіда Антонаўна атрымала пахавальную, дзе скупа паведамлялася: «Ваш брат ст. лейтэнант Астаповіч Аркадзь Антонавіч загінуў смерцю храбрых у в. Рухава-Будзі». Месца пахавання дагэтуль невядома.

Імя Аркадзя Астаповіча пры жыцці было знаёма толькі вузкаму колу мастакоў. У пэўнай ступені прычынай таму маглі стаць уласцівасці характару творцы. Па ўспамінах сястры, гэта быў замкнёны і сціплы чалавек, надзвычай патрабавальны да сябе і сваёй працы. Ён падтрымліваў сяброўскія адносіны з Анатолем Тычынам, Мікалаем Дучыцам, быў знаёмы з Заірам Азгурам. Але, як меркавала сястра Зоя Антонаўна, ніхто з беларускіх мастакоў, якія ведалі яго асабіста, не меў уяўлення пра дыяпазон яго творчасці.

Не быў папулярны ў эпоху сацрэалізму і лірычны пейзаж — любімы жанр Аркадзя Астаповіча. Гэта якраз вялікая частка выстаўкі ў Нацыянальным мастацкім музеі. Упор на кантраст, шматграннасць суіснавання чорнага і белага — тое, што адразу кідаецца ў вочы. Асабліваю тэма для мастака — зімовыя краявіды: «Зімовы дзень» (1921), «Зімовы пейзаж» (1927), «Зіма» (1927), «Вёска зімой» (1928), «З дровамі» (1929)… Шэры, белы, чорны колеры — найлепшыя для мастака-графіка — дазволілі майстру і перадаць стан прыроды зімой, і практыкавацца ў варыяцыях манахромнасці.

Даследчыкі падзяляюць творчы шлях Аркадзя Астаповіча на чатыры перыяды: пецярбургскі, «сваімастацкі» (1914—1916); армейскі (1917—1922); навасёлкаўскі, перыяд творчага ўзлёту (1923—1929); мінскі (1930—1941). Як адзначаюць стваральнікі выстаўкі, экспазіцыя пабудавана так, каб глядач убачыў увесь шлях тонкай і ўзнёслай душы мастака, якая вырывалася за межы вуглоў і простых ліній.

Ледзь не ў кожнай рабоце першых перыядаў счытваецца імкненне да ўзнёсласці — цішыні, спакою, прыгажосці. Знарок стваральнікі экспазіцыі вылучылі зусім маленькую па памеры работу пад назвай «Маладзік» (1923). Тут аўтар працаваў у тэхніках акварэлі і аплікацыі, што дазволіла адлюстраваць і цемру ночы, і святло маладзіка, і колер начнога неба. Гэты ідэалізаваны лаканічны пейзаж мог стварыць толькі чалавек, які яшчэ не звык да хараства жыцця, аддаленага ад мітуслівага горада. Сапраўды, знаходжанне ў вёсцы не магло не паўплываць на мастака: трапіўшы ў Навасёлкі, ён апынуўся ў незнаёмым яму асяроддзі, бо быў прыроджаны гараджанін, хоць, па меркаванні мастацтвазнаўцаў, з крыху змрочным успрыманнем горада.

Між тым на прыродзе ён працягнуў гарадскую серыю «Заводаў» (напрыклад, «Заводскія карпусы», 1926), дзе выкарыстоўваў метад аплікацыі, да якога звяртаўся і пазней. І ўжо ў гэты перыяд відазмяніўся яго погляд на вёску. На некаторых выявах можна ўбачыць прыкметы часу, якія на фоне традыцыйнай вёскі выглядалі, мякка кажучы, незвычайна, хоць аўтару ўдалося стварыць гарманічыя карцінкі. Гаворка тут, напрыклад, пра твор «Трактар» (канец 1920-х). З пераездам у Мінск Аркадзю Астаповічу давялося лічыцца з палітычным станам у краіне: відавочная змена стылю… «Калгас "Авангард". Качагаркі» (1930-я) ды «Каля заводскай ваколіцы» (1936), натуральна, вельмі адрозніваюцца ад серыі «Заводаў». У рэшце рэшт зусім незвычайна ў творчасці мастака выглядаюць работы з назвамі «Дзе крызіс не адчуваецца» (1932) і «Работа вучнёўскай брыгады ў калгасе» (1930-я). Аднак такія творы, як, напрыклад, «Начная дарога» (1928), і тады, і сёння здольны схіліць да глыбокіх разважанняў пра час, людзей і лёс творцы.

Фрагмент экспазіцыі.

Фрагмент экспазіцыі.

— У пачатку 1930-х гадоў яго вобразна-выразная сістэма са спрашчэннем форм да сімвала-знака, у якім заключалася філасофскае выяўленне і рэальнага, і ідэальнага, не магла мірна існаваць у рамках ідэалагізаванага «пралетарскага рэалізму», — лічыць куратар выстаўкі, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела беларускага мастацтва XX—XXI стст. Дзмітрый Салодкі. — Астаповіч паспрабаваў працаваць у згодзе з новымі мастацкімі прынцыпамі, але дасягнуць якіх-небудзь вышынь у чужой яго натуры мастацкай сістэме так і не ўдалося.

Першая персанальная выстаўка Аркадзя Астаповіча адбылася ў 1960 годзе, праз амаль 20 гадоў пасля яго смерці. Пазней з'явіліся кнігі, у якіх быў дадзены аналіз творчасці. Вартасці мастака не засталіся па-за ўвагай даследчыкаў. Між тым некалькі гадоў таму ў выдавецтве «Беларусь» у серыі «Славутыя мастакі з Беларусі» пабачыў свет альбом «Аркадзь Астаповіч». Аўтар тэксту і складальнік — мастацтвазнаўца Надзея Усава. Добра гэта ці не, але выданне яшчэ ёсць у кнігарнях. А на выстаўку ў Мастацкім, дарэчы, цудоўна аформленую, зазірнуць можна толькі на працягу месяца: праект будзе працаваць да 19 снежня.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Для тых, хто ў танку

Гэтымі днямі ў анлайн-кінатэатры *VOKA* адбылася прэм'ера дакументальнага фільма «Свет танкаў і людзей». Новы праект расійскага тэлежурналіста Андрэя Лашака знаёміць з некалькімі кранальнымі гісторыямі з жыцця заўзятых прыхільнікаў сусветна вядомай відэагульні *World of Tanks*, якая была створана і выпушчана беларускай кампаніяй *Wargaming* у 2010 годзе. Спрабуем разабрацца, чаму фільм варты самай пільнай увагі, нават калі вы зусім «не ў тэме».

Кіно ці рэклама?

Новай стужкай Андрэй Лашак працягвае сваё журналісцкае даследаванне альтэрнатыўных медыя, распачатае ім яшчэ два гады таму. Папярэдні вялікі праект рэжысёра «Халівар. Гісторыя рунэту» расказваў, як вынікае з назвы, аб зараджэнні расійскага інтэрнэт-сегмента, гісторыі самой нэт-прасторы, даменаў, найважнейшых рэсурсаў і сацыяльных сетак. Гэтым разам аўтар вырашыў больш сканцэнтравацца на сферы інтэрактыўных забаў, а менавіта на феномене «народных» шматкарыстальніцкіх камп'ютарных гульняў.

Анонс на сайце *World of Tanks*, трэйлер стужкі і яе апісанне — усё гэта намякала на тое, што перад намі шараговы (хай і дарагі) рэкламны ролік, зроблены таленавітымі людзьмі на заказ для вялікай кампаніі. Гэткія сумневы, тым не менш, хутка разбіваліся аб імя рэжысёра, заяўлены хронаметраж (а фільм, між іншым, доўжыцца амаль дзве гадзіны) ды смелую прыстаўку «дакументальны». Забягаючы наперад, скажам, што скепсіс на справе не толькі не апраўдаўся, але і раструшчыўся ўшчэнт. Цяпер падрабязней…

Няхай не пужаюць вас уступныя хвіліны фільма, бо яны папраўдзе мала што аб ім расказваюць. Урачыстая музыка, фразы-акцэнты, хуткі мантаж і пастановачныя кадры фактычна тут жа і канчаюцца. Далейшае дзеянне падпарадкавана выключна натуральнаму парадку рэчаў (а не ўяўным рэкламным законам). Каб канчаткова ўпэўніцца, што на экране якасная дакументалістыка, дастаткова ўсяго толькі некалькі эпізодаў — і фільм пачынае здзіўляць. Здзіўляць, як павінна рабіць гэта сапраўднае дакументальнае кіно.

Людзі і машыны

Асмелімся выказаць меркаванне, што стужка адпачатку здымалася для тых, хто з гульнёю *World of Tanks* (ды віртуальнымі забавамі ўвогуле) не знаёмы. Свет фільма — гэта ў першую чаргу свет людзей і толькі потым танкаў. Што да апошніх, дык яны выступаюць тут не проста як сувязнае звяно паміж усімі героямі, але і як шматзначны сімвал, што аб'ядноўвае нацыі. Атрымліваецца, танк — машына для забойства, магутная зброя, якая заўсёды людзей раздзяляла — становіцца тым самым мастком паміж прадстаўнікамі розных соцыумаў!

Што тычыцца ўласна прадстаўнікоў, то, кажучы словамі аднаго з герояў, «кантынгент» гульцоў падабраўся дужа разнамасны. І хаця праграмісты, не хаваючыся, вызначаюць мэтавую аўдыторыю сваёй дзейнасці простым словам «мужыкі», сярод такіх апынуліся і дарослая жанчына з дзіцем, і ветэраны Чачэнскага канфлікту, і людзі з крымінальным мінулым, і шмат хто яшчэ. Усе яны знайшлі ў віртуальным свеце нешта для сябе, нейкую аддушыну. У кожнага з іх свая гісторыя знаёмства з гульнёй, свая гісторыя зносін з ёю.

Малады хлопец з невялікага пасёлка, які пазбаўлены магчымасці самастойна хадзіць, у рэальным жыцці прымае дапамогу ад напарніка — дарослага растаўчаніна з блатнымі звычкамі… Глыбокія пенсіянеры са змрочнага манагорада Асбест вечарамі збіраюцца перад маніторам, каб згуляць партыю-другую… Паспяховы рэкламшчык з Масквы рыхтуе сеткавую рэвалюцыю… Сталы барысаўскі халасцяк імчыць у Луганск пад выбухі гармат, каб выцягнуць адтуль камандзірку, якую кахае. Пазней яны завядуць сям'ю і дзяцей…

І гэта толькі малая доля з мноства цікавых гісторый, што прапануе фільм. Прытым зроблена ўсё па-дарослому, з захаваннем маўленчых характарыстык і адмысловай лексікі (не заўсёды цэнзурнай). У кадры фігуруюць сцэны, якія звычайна моцна ўплываюць на ўзроставы рэйтынг, — эпізоды курэння і ўжывання алкаголю. Тое лішні раз даказвае: перад намі не стэрыльная рэклама, прызваная прывабіць новых спажыўцоў ці вялікіх інвестараў, а паўнавартаснае шчырае дакументальнае даследаванне. Як кажуць, без прыкрас.

Прамень надзеі

З прычыны абмежаванасці друкарскіх плошчаў альбо хронаметражу журналісты нярэдка (напрыклад, у тэксце,

які цяпер перад вамі) прычэпліваюць героям сваіх матэрыялаў ярлыкі — кароткія запамінальныя характарыстыкі, якія дапамагаюць стварыць агульнае ўяўленне аб тым ці іншым чалавеку. А вось рэжысёр фільма «Свет танкаў і людзей» такім, наадварот, не злоўжывае. Людзі тут скрозь супярэчлівыя, асяроддзе ж, якое іх акаляе, шматмернае і складанае. Апісанне накшталт «з блатнымі звычкамі» зусім не вычарпальнае.

Паколькі ў дадзеным выпадку мы маем справу з дакументам, а не мастацкім вымыслам, рэжысёр не можа дазволіць сабе сімпатызаваць канкрэтным героям. Але калі ён і не любіць дзеючых асоб, дык дакладна ставіцца да іх з павагаю. Гэткім прынцыпам, відаць, кіруецца ў сваёй працы Андрэй Лашак, і яно вельмі адчувальна. Прытым ніякай павучальнасці, ніякага маралізатарства чакаць не даводзіцца, усе высновы — на водкуп гледачам. А тут ужо ў справу ўступае, як вядома, асабісты досвед і глыбіня глядацкай дасведчанасці.

Найбольш уражвае своеасаблівая дыялектычнасць аповеду — рыса, увогуле ўласцівая почырку рэжысёра. Зараз паспрабуем растлумачыць, што маецца на ўвазе. У поле зроку дакументаліста трапляюць пераважна людзі з — даруйце за гэткую лексіку — простанароддзя. Індывідуумы без індывідуальнасці, не абцяжараныя асаблівым інтэлектам, вытанчанымі густамі і музычным слыхам, менавіта яны і ствараюць сабой праслаўты натоўп.

Але рэжысёрам такі погляд на свет якраз абвяргаецца! У яго разуменні гэта сапраўдныя «маленькія людзі» (як у тых класікаў). Нягледзячы на пэўную сацыяльную няроўнасць, знешне яны ўсё адно досыць падобныя, пасрэдныя, упісаныя ў масу, але прытым кожны са сваім унутраным жыццём, не менш важным за думкі некаторых іншых. У іх сэрцах гарыць святло, бліскаюць іскры ды заўсёды прыхавана месца для радасці і пяшчоты… Ёсць у тым нешта замілавальнае, гуманнае, што ажно слёзы наварочваюцца.

Партрэты

Здымаючы фільм «Свет танкаў і людзей», рэжысёр Андрэй Лашак застаўся верным сабе і свайму творчаму крэда. У новай стужцы праявіліся ўсе адметныя асаблівасці яго кінамовы. І тут няма памылкі, бо, несумненна, перад намі не проста журналістыка, а перш за ўсё кіно. Калі ж выкарыстоўваць звыклыя тэрміны, то ў дадзеным выпадку больш карэктна казаць аб журналістыцы аўтарскай, ці, іншымі словамі, публіцыстыцы. Менавіта аўтарскі погляд выдзяляе работы Андрэя Лашака на фоне многіх іншых дакументальных праектаў.

Само сабой напрошваецца параўнанне са знакамітым амерыканскім праўдашукальнікам Майклам Мурам. Канешне ж, аналогія дастаткова прыцягнутая, але дакладна не беспадстаўная. Творчасць дакументаліста-суперзоркі (што адно ўспрымаецца як аксюмаран), які здабыў славу неігравымі блакбастарамі, адметная якраз крайняй персаналізаванасцю. Вось і Андрэй Лашак у сваіх фільмах сам чытае закадравы тэкст, сам бярэ інтэрв'ю і ўдзельнічае ў экранным відовішчы, нярэдка трапляючы ў кадр.

Акрамя таго, апошняй рабоце рэжысёра (зрэшты, як і астатнім) уласцівы адмысловыя калажнасць і калейдаскапічнасць. Звыклыя інтэрв'ю дапаўняюцца рознага роду ілюстратыўным матэрыялам, часцяком зманціраваным як кліп (тут вам і кадры гульнявога працэсу, і відэа з асабістых архіваў, і тэлевізійная хроніка, і нават анімацыйныя ўстаўкі). Такі падыход добра стасуецца з асноватворным «паказвай, а не расказвай». Калі паведамляецца пра разбітыя ў гневе мышкі, то на экране павінны быць адпаведныя здымкі з уласнага архіва героя.

Іншай рысай аўтарскага почырку Андрэя Лашака з'яўляецца іронія, але не з'едлівая. Напрыклад, як толькі на авансцэну выходзіць чалавек з мянушкай Бандэрас, фонам пачынае іграць зборная мексіканская музыка (сапраўдны Бандэрас праславіўся ролямі мексіканцаў)… Падаючы такім манерам гісторыю адной асобнай відэагульні, аўтар чарговы раз умудраецца стварыць падрабязны партрэт сучасніка. Прытым карціну рэжысёр малюе, як было сказана, дужа далікатна, не ставячы дыягназаў і не выносячы прысудаў. Гэткае ўменне якраз і адрознівае буйнога аўтара ад дробных чалядзнікаў.

Мікіта ШЧАРБАКОЎ

Літаратура і мастацтва № 45 12 лістапада 2021 ЛіМ

Край свету ды… беларускі свіран

Упараўнанні са стрыечным братам Дзмітрый Лапцеў па службе рухаўся хутка. Праслужыўшы тры гады гардэмарынам, стаў мічманам. Яшчэ праз год — унтэр-лейтэнантам. Прызначылі камандзірам шнявы «Фаварытка». Гэта невялікае ветразевае судна, якое можа быць гандлёвым ці ваенным. Унтэр-лейтэнант Лапцеў служыў на ваенным. Хадзіў на ім па Фінскім заліве. Аднак марыў аб далёкіх паходах. Ды і аб адкрыцці новых зямель. Пётр I не толькі «в Европу прорубил окно». Першы расійскі імператар шмат рабіў і для пашырэння тэрыторыі сваёй дзяржавы. Юнаму Лапцеву так хацелася быць сярод тых, хто мае да гэтага дачыненне. Ды і ўзрост меў такі, у якім здаецца, што і мора па калена.

Дзмітрый Лапцеў.

Аднак да ажыццяўлення мары было яшчэ далекавата. Тры гады камандаваў фрэгатам «Святы Якаў» — ваенна-парусным трохмачтавым караблём. Калі служыў на фрэгаце «Расія», павысілі ў званні да лейтэнанта. Пры перайменаванні флоцкіх чыноў стаў лейтэнантам марскога рангу.

Жаданае збылося з назначэннем у Вялікую Паўночную экспедыцыю. Яе арганізавалі для вывучэння і нанясення на карту арктычнага ўзбярэжжа Сібіры, а таксама Камчаткі і Камчацкага, цяперашняга Ахоцкага мора. Ды яшчэ берагоў Паўночнай Амерыкі і Японіі. У гэтай экспедыцыі ўдзельнічала каля 600 чалавек. Праводзілася яна сям'ю асобнымі атрадамі.

У 1735 годзе Дзмітрый Лапцеў прыбыў у Якуцк, дзе даручылі даставіць па рэках грузы ў раён Ахоцка, а пасля арганізаваць там будаўніцтва складоў. З задачай справіўся хутка і паспяхова. Збіраліся даверыць яму адзін з атрадаў. Ды лёс распарадзіўся так, што прадоўжыў справу Ласініуса. Швед па нацыянальнасці, прыняты на рускую службу, шмат плаваў. У экспедыцыю запісаўся добраахвотна. Яго атраду даручылі даследаваць бераг ад вусця Лены да Камчаткі.

З Якуцка выправіліся на боце «Іркуцк» у канцы чэрвеня, а ў пачатку жніўня дасягнулі ўзбярэжжа. Паколькі бот — аднамачтавае ветразевае судна, чакалі спадарожнага ветру. Ён падзьмуў толькі на трэція суткі, ды яшчэ і аказаўся кепскім памочнікам — часта мяняў напрамак. Іншым разам зусім бязветрана станавілася. Перашкаджалі плыць і вялікія скапленні лёду.

Заставалася рыхтавацца да зімоўкі. Выбралі вусце ракі Хара-Улах. З якуцкай мовы перакладаецца як «чорная вада». Хоць яна тут такая, як і паўсюдна на ўзбярэжжы, але ў лёсе падарожнікаў пралягла чорнай паласой.

Спачатку, праўда, нішто не прадракала бяды. На беразе было шмат плаўніку, таму без асаблівых цяжкасцей узвялі з яго жытло. Ды падвяла празмерная ашчаднасць Ласініуса. Упэўнены, што для выканання задання спатрэбіцца яшчэ два гады, для эканоміі прадуктаў рацыён зменшыў удвая. А ўсе і так былі знясілены. Да недаядання дадалася цынга. Як змагацца з ёю, у абарыгенаў не пацікавіліся. 38 чалавек памерлі. Першым развітаўся з жыццём сам Ласініус.

Атрад узначаліў штурман Васіль Рцішчаў. Але і ён быў цяжка хворы. Падабраўшы новых людзей, начальнікам экспедыцыі прызначылі Дзмітрыя Лапцева. Перад адпраўкай на старых картах яму паказалі нейкі востраў. Сказалі, што гэта «якобы земля великая». Тут быццам «бывали из сибиряков и людей видели». «Землю великую» і загадвалі яму шукаць на працягу двух гадоў. Таксама высветліць наяўнасць неадкрытых астравоў.

Яшчэ не ведалі, ці сходзіцца «сибирский берег с американским». Па-сучаснаму — Чукоцкі паўвостраў з Аляскай. Пры адсутнасці праліва раілі ісці на поўнач. Высветліць, наколькі далёка па другі бок перашыйка «Полуденное или Восточное море» — тагачасная назва Ціхага акіяна. Пры наяўнасці праліва — кіравацца да Камчаткі, у крайнім выпадку — да вусця ракі Анадыр.

Атрымаў і інструкцыю паводзін з туземцамі. Рэкамендавалася не азлабляць іх, ставіцца з даверам. Тады самі згодзяцца прыняць рускае падданства. Ахвотней будуць плаціць ясак.

Каб даведацца пра лёс тых з атрада Ласініуса, хто выжыў, Дзмітрый Якаўлевіч, не чакаючы ледаходу, да месца іх зімоўкі паслаў невялікі атрад штурмана Міхаіла Шчарбініна. У жывых заспелі толькі дзевяць чалавек. Ды і тыя хварэлі на цынгу.

Пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Лапцева 29 ліпеня 1736 года выйшлі ў мора 35 чалавек. Плылі на тым жа боце «Іркуцк», што Ласініус. Выпрабаванняў ставала. Але горкі вопыт папярэдніка пайшоў на карысць. Гэта засведчыла першая зімоўка.

Размясціліся ў пяці пабудаваных дамках. Каб не захварэць, пілі спецыяльны адвар з кары і шышак кедравага сланіку. Невядома, ці самі дадумаліся, ці падказалі туземцы. Але мала хто захварэў. Ды і памёр толькі адзін чалавек.

На «Іркуцку» атрад спусціўся ў вусце Лены. Для больш паспяховага вывучэння мясцовасці каманду Лапцеў падзяліў на дзве групы. Адна павінна была ісці да вусця ракі Яна. Другая — да Індыгіркі. Сам паплыў на ўсход. Але рухаліся нядоўга, бо напаткалі суцэльныя льды. Спачатку іх, хоць і з цяжкасцю, пераадольвалі. Аднак насупраць вусця Індыгіркі судна аказалася ў лядовым палоне.

Малілі Усявышняга, каб толькі яны не расціснулі «Іркуцк». Самі ж хуценька высадзіліся на бераг. Пашанцавала, што было шмат плаўніку. А як дзейнічаць у падобных выпадках, вопыт ужо мелі. Не так і шмат часу прайшло, як з'явілася прыстойнае для гэтых месцаў жытло.

Што ўжо казаць пра абарыгенаў. Дзеці прыроды, яны толькі бралі ў яе. Часам нават не палявалі на пушных звяроў, а раскопвалі іх норы, каб прасцей высачыць звераняў. Часта падпальвалі лес дзеля пасяўных дзялянак. Абурала яго і бесчалавечнасць асобных зборшчыкаў ясаку. Забіралі столькі, што туземцам нічога не заставалася. Ганебнай з'явай стала выкарыстанне заложнікаў. Іх бралі, каб паскорыць выплату таго ж ясаку. Ці запалохаць іншых, зрабіць больш паслухмянымі...

Калі дазваляла надвор'е, абследавалі ўзбярэжжа. З нецярпеннем ды трывогай чакалі вясну. Вельмі хацелася больш дэталёва вывучыць гэты ўчастак сушы. Але трывожыліся, каб лёд раставаў паступова: хутка зрушыўшыся з месца, ён можа пашкодзіць судна, а то і патапіць. Для змяншэння небяспекі паклікалі на дапамогу абарыгенаў. Яны разбівалі лёд вакол бартоў. У гэты час некалькі чалавек з каманды апісвалі марское ўзбярэжжа да вусця ракі Калымы.

Са з'яўленнем чыстай вады туды і накіраваўся «Іркуцк». Лапцеў хацеў дасягнуць праліва, які цяпер носіць імя Берынга. Каб з яго выйсці ў Ціхі акіян. І выйшаў бы, калі б не напаткалі суцэльны лёд. Давялося вяртацца да вусця Калымы. Спыніліся каля невялікага Ніжне-Калымскага астрога. У дзесяці дамках месца камандзе знайшлося.

Па просьбе Дзмітрыя Якаўлевіча ў астрозе пабудавалі дзве вялікія лодкі. Пасля зімоўкі «Іркуцк» прадоўжыў плаванне. Наперадзе судна на кожнай лодцы знаходзіліся мясцовыя казакі. Яны шукалі ў лёдзе праходы. Вымяралі глыбіню, каб «Іркуцк» не сеў на мель. Дзе лепш прайсці, паказвалі сігналамі.

Ды калі не шанцуе, то не шанцуе. Каля месца, ад якога раней павярнулі назад, ільдзіны аднеслі лодкі ўбок. А новая паласа неўзабаве і раструшчыла іх. Яшчэ добра, што казакі ўратаваліся, своечасова высадзіўшыся на трывалы лёд! Аб прадаўжэнні плавання давялося забыць. Лядовы наст губляўся за гарызонтам. «Іркуцк» вярнуўся ў Ніжне-Калымскі астрог.

Аднак Лапцеў адступаць не збіраўся. У паход выправіўся на 45 сабачых запрэжках. Каля вусця Анадыра чакалі загадзя падрыхтаваныя нарты з аленямі. Паспяхова пераадолелі горны хрыбет Гылан. Выйшлі на правы прыток Анадыра — раку Яблон.

На зімоўку спыніліся ў Анадырскім астрозе. А летам Дзмітрый Якаўлевіч апісаў раён ніжняга цячэння ракі Анадыр і нанёс яго на карту. Восенню вярнуўся ў Ніжне-Калымск. Рыхтаваўся да справаздачы Адміралцейств-калегіі.

Удалося, канешне, не ўсё, аднак і зроблена шмат. Даследаваў і нанёс на карту вусце Лены і частку марскога ўзбярэжжа. Апісаў басейн і вусце ракі Анадыр і басейн Вялікага Анюя. Як і ўсе першапраходцы, дбаў аб пашырэнні тэрыторыі краіны. Аднак, бадай, як ніхто іншы, задумваўся над будучай карэннага насельніцтва. Нават у большай ступені, чым яго стрыечны брат Харытон Пракопавіч. Пра гэта таксама сказаў у сваёй дакладной запісцы ў Адміралцейств-калегію.

Нагадаў аб тым, што трэба зрабіць для паляпшэння жыцця паўночных народнасцей. Для авалодвання граматай рэкамендаваў прыслаць настаўнікаў і святароў. Непакоіўся пра захаванне прыродных багацця. Тады пра гэта мала хто думаў. Лічылася, што яны бясконцыя.

Што ўжо казаць пра абарыгенаў. Дзеці прыроды, яны толькі бралі ў яе. Часам нават не палявалі на пушных звяроў, а раскопвалі іх норы, каб прасцей высачыць звераняў. Часта падпальвалі лес дзеля пасяўных дзялянак. Абурала яго і бесчалавечнасць асобных зборшчыкаў ясаку. Забіралі столькі, што туземцам нічога не заставалася. Ганебнай з'явай стала выкарыстанне заложнікаў. Іх бралі, каб паскорыць выплату таго ж ясаку. Ці запалохаць іншых, зрабіць больш паслухмянымі...

Надаваў вялікае значэнне заахвочванню суднаходства па Лене. Дзякуючы гэтаму, з вярхоўяў Лены ў дастатковай колькасці пачне дастаўляцца зерне, ніткі для рыбалоўных і марскіх сетак. А яшчэ — жалезныя катлы, нажы, сякеры, іншыя тавары. Усё, чаго з нецярпеннем чакаюць насельнікі нізоўяў Лены, Яны, Індзігіркі, Калымы.

Палярную экспедыцыю завяршыў капітанам 3-га рангу. Гэта адпавядае званню маёра ў сухапутных войсках. У Адміралцейств-калегіі ўзначаліў упраўленне, у падначаленні якога знаходзіліся верфі, будынкі, іншыя збудаванні флоту. Потым пяць гадоў камандаваў адным з караблёў Кранштацкай эскадры. Даслужыўся да звання контр-адмірала (адпавядае генерал-маёру сухапутных войскаў). У адстаўку пайшоў у 1762 годзе віцэ-адміралам (а гэта генерал-лейтэнант).

У вечнасць адышоў 31 студзеня 1771 года ў сваёй роднай вёсцы.

Каля паўднёва-ўсходняга берага Усходне-Сібірскага мора назва адной бухты для тамашніх мясцін нечаканая — Амбарчык. Амбар, амбарчык — тое ж самае, што і беларускі свіран. Але ж амбараў-свірнаў на Поўначы ніколі не было. Чаму ж з'явілася гэтакая бухта? Значыць, нехта такую назву «падказаў». Падказчыкам стаў… Дзмітрый Лапцеў.

Перад паходам яго атрада ад вусця Калымы на раку Анадыр Дзмітрый Якаўлевіч загадаў пабудаваць склады паміж мысамі Стаўбавы і Мядзведжы. Пазней бухту, паблізу якой яны знаходзіліся, і сталі называць Амбарчыкам. Бліжэй да нашых дзён на беразе яе з'явіўся аднайменны пасёлак. Цяпер там, праўда, ніхто не жыве. Але на мясцовай метэастанцыі пастаянна нясуць вахту некалькі палярнікаў.

Так, хай сабе і ўскосна, увекавечана памяць пра гэтага выдатнага палярнага даследчыка. А ўвогуле ён, як і Харытон Пракопавіч, увагай нашчадкаў не абыдзены. Аб гэтым найперш сведчыць назва аднаго з самых суровых мораў Паўночна-Ледавітага акіяна — мора Лапцевых.

Імем Дзмітрыя Лапцева названы мыс у дэльце Лены. Яго імя носіць і праліў паміж востравам Вялікім Ляхаўскім і мацерыком.

Памяць жа пра Харытона Лапцева ўвекавечваюць тры мысы. Два знаходзяцца каля паўвострава Таймыр. На паўночна-ўсходнім баку вострава Пілота Махоткіна. Васіль Махоткін — удзельнік Першай савецкай высокашыротнай паветранай экспедыцыі. З-за асобай павагі да гэтага палярнага лётчыка ў назве вострава да прозвішча дадалі не імя, а яго прафесію.

Каб не было блытаніны, адзін з іх называецца мысам Лапцева, другі — Харытона. А на ўсходніх берагах згаданага паўвострава выступае ў мора мыс Харытона Лапцева. Ёсць яшчэ і бераг Харытона Лапцева. Гэта ўчастак сушы паміж вусцямі рэк Пясіны і Таймыры.

Адзін з разведвальных караблёў Ваенна-Марскога флоту СССР быў названы ў гонар Харытона Лапцева. Пра яго і яго брата нагадвае і памятны знак, устаноўлены на месцы былой вёскі Болатава.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Сын Беларусі і Арменіі

Пайшоў з жыцця Ганад Чаркказян — цудоўны чалавек, вядомы паэт, празаік, аўтар кніг для дзяцей. Яму было 75 гадоў.

Пісьменнік нарадзіўся 18 кастрычніка 1946 года ў Арменіі ў сям'і селяніна. Бацька Ганада Чарказяна ў час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пасля заканчэння Ерэванскага тэхнічнага вучылішча працаваў токарам у г. Туапсэ Краснадарскага краю. У 1973 годзе пераехаў у Мінск. Ажаніўся. Завочна скончыў індустрыяльна-педагагічны тэхнікум у г. Ерэване (1975 г.).

Фота Кастуся Дробава.

У 1984 г. атрымаў дыплом Беларускага політэхнічнага інстытута па спецыяльнасці «інжынер-будаўнік». Працаваў у Мінску ў розных будаўнічных арганізацыях. Вырас ад рабочага да начальніка ўчастка. З 1993 да 2004 года — загадчык аддзела выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Першы яго верш быў надрукаваны ў 1963 г. у часопісе «Піянер» (г. Ерэван). З гэтага часу Ганад Чарказян — пастаянны аўтар часопісаў і газет Арменіі. У Беларусі выдаваўся з 1977 года. Пісаў на армянскай, курдскай, рускай мовах.

Пуцёўку ў беларускую літаратуру атрымаў ад народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі. Аўтар многіх кніг паэзіі і прозы, у тым ліку і перакладзеных на беларускую мову: «Цвет доброты» (1986), «Пространство и время» (1990), «Обожженные жаворонки» (1992), «Плач» (1994), «Караваны гор» (1996), «Казкі дзеда Ганада» (1996), «Шамдин» (1998), «Камни печали» (1990), «Чаргави» (2001), «Дом дождя» (2001), «Тоска по дому» (2003), «Пум-пур в коляске и другие сказки» (2004), «Опередить смерть» (2005), «Зорная глыбіня» (2005), «Мелодия разлуки» (2006), «Мир под крылом» (2008), «Бяжыць жыцця дарога» (2019), «Дорога на Ушачи» (2020) і іншых.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1988 года. Член СП Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Актыўная літаратурная і грамадская дзейнасць Ганада Чарказяна адзначана шматлікімі ўзнагародамі. У тым ліку і медалём Францыска Скарыны.

Памяць пра шаноўнага калегу, выдатнага сябра назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Прэзідыум Саюза пісьменнікаў Беларусі

Мікола МЯТЛІЦКІ

Светлай памяці Ганада Чарказяна

І ты пайшоў з жыцця, мой верны друг,
Душа мая заходзіцца наўзрыд.
Замкнуў твайго быцця пакутны цуг
Бязлітасны, учэпісты кавід.

Ты горац быў. І з мудрасцю спаўна
Узважваў свой анкалагічны лёс
І ведаў цвёрда, што жыцця цана
Складаецца і з радасці, і з слёз.

Ты мужным быў. Хваробе смела ў твар
Глядзеў, у бітве сцісшы кулакі, —
І ў новых днях, упарты з ёй змагар,
Тварыў-пісаў натхнёныя радкі.

У юны час, сышоўшы з вышніх гор,
Прынёс агонь жывы, не сэрца стынь:
Ты палюбіў зялёны наш прастор
І Нарачы прасветленую сінь.

Зарана ў вечнасць рушыў, друг, сваю,
Адкуль адно аклікне успамін.
З журбой пад небам восені стаю
І чую: плача жураўліны клін.

У незваротны вырай

Дзень першы і Дзень апошні.
Паміж імі — Жыццё.

Першы дзень ва ўсіх аднакавы. Хочацца спаць і пакаштаваць мамінага малачка. У сям'і, радні — свята! Вытыркнулася новая галіна радаводу. Зялёненькі пялёстак. Гуляй, Зямля, у цябе свежанькі *Homo sapiens*.

Апошні дзень — самотны, слёзны, жалобны. Адлятае ў незваротны вырай той, хто быў у жывой яве. Бывай, доўга нас чакай! І шлём наўздагон пахвальбу, пакаянне, просьбу, абяцанне. Вось і ўвесь сказ пра зямное гасцяванне.

Э не, браточкі!

Паміж першым і апошнім днём — Жыццё.

Наш брыльянт. Скарб. Неацэнная каштоўнасць. Залацінка ў рудзе. Яно — наша бяссмерце. Не спяшайма развітацца з ім.

На далоні часу, на вагах чалавечнасці ацэнім пражытае. Ці варта яно памяці? Ці ёсць у яго жыццё пасля жыцця?

Дужа цяжкі іспыт. Ён не праміне кожнага, да каго пастукаецца апошні дзень. Чакаць — толькі час марнаваць. Рыхтуемся да яго з першага дня!..

Дарагі Ганад! Ты ў сэрцы маім, пакуль яно будзе выстукваць марзянку жыцця.

Уладзімір ЛІПСКІ

Свет пацяснеў

У мяне больш чым дзясятак кніг з яго дарчымі надпісамі. Ці не столькі разоў пісаў пра яго творчасць. Збіраўся прарэцэнзаваць і новую, што выйшла напярэдадні яго нядаўняга 75-годдзя. На жаль, не паспеў забраць у аўтара. Прычына для сённяшняга дня зразумелая — па магчымасці менш кантактаваць. Ганаду Чарказяну гэта тым больш было неабходна. Не адзін год пакутаваў ад цяжкай хваробы. Яна справакавала іншую, цяпер асабліва распаўсюджаную. Праходзячы неабходныя працэдуры, трапіў у яе сіло. Аслаблены арганізм не справіўся. Таму не рэцэнзію пішу, а прамаўляю традыцыйнае ў такіх выпадках: «Бывай».

Сказаць добрага, ухвальнага, а галоўнае, справядлівага пра яго можна шмат. Гэта быў яркі, арыгінальны паэт. Гэтакі ж самабытны празаік. Пра такіх творцаў звычайна кажуць: меў талент, самім Усявышнім дадзены. А чалавек… Падобных пашукаць трэба. Які заўгодна высокі эпітэт падбірай — лічы, што пра яго, Ганада Чарказяна, сказана.

Хросным літаратурным бацькам яго стаў Пятрусь Броўка. З прадмовай Петруся Усцінавіча і выйшла яго першая кніга «Прочность». Заўважылі, падтрымалі, ухвалілі Ганада Чарказяна і Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў…

І гэта таксама гаворыць само за сябе. Як і тое, што яго творы з задавальненнем перакладалі на беларускую і рускую мову (сам жа, як вядома, у асноўным пісаў па-курдску) многія знакамітыя паэты. Тое ж самае тычыцца і прозы, адметнай сваёй філасофскай напоўненасцю, горскай прытчавасцю. Курд-езыд па нацыянальнасці, ён паступова стаў беларусам па духу:

О, Беларусь — як песня, як вясна.
І блізкай ты здаешся, і далёкаю.
За ўсё табе я ўдзячны сінявокая,
Ты засталася у мяне адна.

(Тут і далей пераклад
Казіміра Камейшы)

Цяпер сама Беларусь засталася без яго. І адразу, кажучы назвай аднаго з яго вершаў, «свет пацяснеў». Пішучы гэты твор, Ганад Чарказян прызнаваўся ў няўтульнасці у буднях паўсядзённасці. У гэтыя журботныя дні сказанае некалі набывае іншы сэнс:

Крочу я па гарах,
Мераю я прасторы.
А на шляху —
Млечны Шлях,
Сэбраная поўня і зоры.

Сапраўды, перад ім ужо адкрываецца Млечны Шлях. Ганад Чарказян, здатны ў сваёй паэзіі заставацца сам-насам з днём сённяшнім і самім Сусветам, адплывае ў вечнасць, ведаючы тое, пра што нам, жывым, не дадзена дазнацца. У гэтым ён як бы над намі. Балюча і горка без яго. Але там, у нязведанай далі, Ганад Чарказян будзе заставацца з намі, думаючы пра нас. Інакш і быць не можа, бо такім клопатным і ўважлівым чалавекам быў. Хоць, чаму быў? Ім і застаецца. Толькі ўжо ў іншай іпастасі.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

З'яднаны лёсам з нашай зямлёй

Не думаў, што буду гаварыць пра свайго даўняга сябра ў мінулым часе. Зусім нядаўна віншаваў яго з юбілеем, а на днях прыйшла жахлівая вестка, што Ганада Бадрыевіча не стала. Не стала ў тыя дні, як яго апавяданні ў перакладзе на беларускую мову загучалі на хвалях канала «Культура».

Лёс Ганада Чарказяна настолькі глыбока і трывала звязаны з айчыннай літаратурай, з Беларуссю, што высокае званне беларускага пісьменніка, якім ён даражыў, упрыгожыла не толькі яго як творцу, але і стала гонарам нашай зямлі, народа.

Таварыскі, шчыры, ён стаў неад'емнай часткай пісьменніцкай сям'і, па-сапраўднаму сваім і блізкім для многіх людзей. Бадай, цяжка знайсці сярод творцаў чалавека, які б не сустракаўся хоць раз з яго шчырай усмешкай, сяброўскімі словамі і ўчынкамі.

І мяне Ганад Бадрыевіч не раз саграваў цеплынёй, спагадай. Мне давялося быць вядучым на яго сустрэчах з чытачамі, удзельнічаць у сямейных святах. Беларуская радня яго любіла і шанавала, ён адчуваў сябе ў нашай краіне як ва ўласным доме.

Спачуваючы лёсу свайго народа, ён не аддзяляў свой лёс ад Беларусі, думаў і клапаціўся пра наш родны край, горда называў сябе беларускім пісьменнікам.

Ён і застаўся з намі — сваімі творамі, поўнымі чалавечай цеплыні і светлага смутку, любові да людзей, да нашай зямлі.

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ глыбока смуткуюць з прычыны смерці пісьменніка Ганада Бадрыевіча ЧАРКАЗЯНА і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» смуткуе ў сувязі са смерцю свайго былога супрацоўніка, пісьменніка Ганада Бадрыевіча ЧАРКАЗЯНА і выказвае глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

Простыя рэчы

Індзейская рамантыка не памірае

Здавалася б, што агульнага можа быць у беларусаў і індзейцаў? Розныя кантыненты, гісторыя, культура, зрэшты, тыпалогія… Але, як высветлілася, нават полюсы здольны прыцягвацца. Аўтар артыкулаў у акадэмічных выданнях Беларусі і краін, што з ёй мяжуюць, а таксама ЗША, Алесь Сімакоў на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў захоўвае вернасць беларуска-індзейскай тэматыцы. Сёння гутарка з даследчыкам пра яго навуковую зацікаўленасць.

Фота з асабістага архіва А. Сімакова.

Алесь Сімакоў.

— Як узнікла і на чым грунтавалася ваша цікавасць да індзейцаў?

— Адказваючы на вашы пытанні, згадваю тое, што застаецца нязменным з 1989 года, калі рабілася грунтоўная спроба падсумаваць першыя вынікі рэалізацыі цікавасці. Гэта быў даклад на І Заслаўскіх чытаннях, і ён, па словах рэдактара аднаго з мінскіх выданняў, выглядае актуальным і цяпер.

Актывізацыя цікавасці да індзейцаў назіраецца ў 1973—1976 гг. у сувязі з уздымам паніндзеянізму ў Паўночнай Амерыцы; з канца 1970 — пачатку 1980-х гадоў прадстаўнікі Беларусі ўдзельнічаюць у так званым індзеянісцкім руху — маладзёжным, аматарскім: усесаюзных «паўваў» (своеасаблівых фестывалях), вывучэнні індзейскай гісторыі і культур, вырабе «індзейскіх» рэчаў, кампаніі салідарнасці з індзейцамі.

Сярод індзеяністаў знайшліся і тыя, хто вывучаў сувязі з Амерыкай сваіх краін або мясцін. Але многія аказаліся зусім абыякавымі да ідэі згуртавання. У выніку ў кнізе пра гэты рух маскоўскага пісьменніка-індзеяніста Андрэя Няфёдава «Галасы» (2019) знаходзім выказванне Танта (ён жа — Алег Жылінскі, прыхільнік індзейскага ладу жыцця) пра Беларуска-індзейскае таварыства (БІТ): «Нейкая дзіўная арганізацыя, я да гэтага часу не разумею яе сэнсу, але яна існуе…» Танта шануе толькі веды, уменні і рэчы, якія карысныя ў лесе. Сфармуляваў жа гэтую думку ў стылі бяздушнага чыноўніка, а не філосафа-«гурона». Да таго ж добра б было не проста любіць прыроду ў злучэнні з «індзейскімі» фантазіямі — як Танта, але і прыгожа апісаць гэта — як Генры Тора.

— Ці ёсць у светапоглядзе індзейцаў і беларусаў нешта агульнае і ў чым яно выяўляецца?

— Беларусы аказваюцца ў пакутлівым стане амбівалентнасці: яны робяцца такой жа ахвярай экспансіі Еўропы, як і народы Заходняга паўшар'я, але ў той жа час далучаюцца да каланізацыйнай хвалі адначасова ў двух напрамках — Сібір і Амерыка. Можна шмат разважаць пра перыяды агульнай дэпрэсіі на этнічнай тэрыторыі і нацыянальную апатыю, сучасныя працэсы рэвіталізацыі — адраджэння і іншае. Але каб уявіць усю неверагодную рамантыку, успомнім самыя знакавыя роды Беларусі і самыя адметныя сімвалы. Можна прасачыць падабенства не толькі гістарычнага лёсу беларусаў і індзейцаў, але і матэрыяльных атрыбутаў, сацыяльна-эканамічных сістэм, прынесеных прышэльцамі і часткова навязаных карэнным народам: даследчыкамі адзначалася, што касцёлы і кляштары Вялікага Княства Літоўскага вельмі нагадваюць культавыя збудаванні Мексікі і Бразіліі, а паншчынныя гаспадаркі — сістэму энкам'ендас; калі Альберт Радзівіл — прадстаўнік роду, вядомага сваімі каласальнымі ўладаннямі на Беларусі, апынуўся ў Мексіцы, то адразу зрабіўся найбуйнейшым землеўладальнікам на поўначы гэтай краіны. Не могуць не ўражваць і эмацыянальна ўзрушваць пранізлівa падобныя карціны ад'езду моладзі з рэзервацый і нашых вёсак і нячастыя выпадкі вяртання апанаваных імкненнем служыць свайму народу. У сувязі са значнай «закансерваванасцю» традыцыйнай культуры беларусаў, перш за ўсе захаваннем дахрысціянскіх перажыткаў, даволі вялікай аказалася чыста этнаграфічная кампаратывістыка, у якую найбольшы ўклад унеслі М. Доўнар-Запольскі, В. Машкоў, М. Нікольскі і некаторыя іншыя.

— Ці даводзілася вам бываць на землях індзейцаў і калі не, то ці марыце вы пра вандроўку туды?

— Не, але два сябры БІТ нават пераехалі ў ЗША. Сляды аднаго, на жаль, згубіліся недзе на Усходзе, а другі ў Сан-Францыска сустракаўся з індзейцамі, дапамагаў нам інфармацыяй. Былі сітуацыі, калі нам рабілі прапанову прыехаць на мерапрыемствы або ў госці. Мая адзіная сустрэча з індзейцам адбылася ў Беларусі — з навахскім флейтыстам і апавядальнікам Уільямам Язі, рэйнджарам з арызонскага запаведніка, які быў запрошаны ў 1996 годзе дзякуючы нашай актыўнасці. Беларусы маглі ўбачыць «карэнных амерыканцаў» або асоб з часткай адпаведнай крыві, якія бывалі або жылі ў Мінску, — турыстаў, спартсменаў, удзельнікаў савецка-амерыканскай сустрэчы ў Мінску, выкладчыкаў мінскага ВНУ і «Місіс Сусвет-2015». Лацінаамерыканцы з індзейскімі каранямі, якія вучыліся ў познесавецкі час у нас, асабліва ў Горках (сапраўдныя кечуа, аймара), з якімі сустракаліся мае таварышы, з'ехалі. Я перапісваўся з сотнямі асоб індзейскага паходжання — усе яны пераважна з Канады і ЗША. Выбіраў адрасы для кантактаў у сувязі з асноўнымі тэмамі, сярод якіх даследаванне тлінкітаў і «Апачэрыя». Звязваўся з прадстаўнікамі ўсіх шасці асноўных груп апачаў. Я чалавек «кабінетнага тыпу», таму адсутнасць паездак не траўміруе, мару больш расказаць пра незвычайныя сустрэчы з індзейцамі іншых беларусаў — пачынаючы аж з XVI ст.

— Што асаблівага ў індзейцах Паўночнай Амерыкі, чаму менавіта гэтая лакалізацыя, а не, скажам, Паўднёвая Амерыка?

— Калі быў у гасцях у Сяргея Картэса, аўтара балета «Апошні інка», абмяркоўвалі пытанне, чаму маладых людзей больш цягне да паўночнаамерыканскіх індзейцаў. Спадзяюся, мэтра не пакрыўдзіла мая рэпліка: «Яны больш рэспектабельныя». Меўся на ўвазе больш суровы, самавіты, паважлівы выгляд, адпаведная манера паводзіць сябе. Хаця і індзейцы Каліфорніі, аднаго з нашчадкаў якіх апісаў доктар Русель у творы «Па Каліфорніі» (публікацыя па-беларуску ў 2021 г.), ужо носяць рысы «субтрапічных» індзейцаў. У той жа час мапучэ хоць і знаходзяцца вельмі далёка на поўдзень, мужныя і гераічныя «па-паўночнаму», гэткія «аўстраль».

Мой асноўны партнёр у Гомелі Аляксандр Снітко (Мачэтэ) — магчыма, першы індзеяніст у гісторыі Беларусі — цікавіцца ўсёй Амерыкай, але найперш самымі «індзейскімі» краінамі — Гватэмалай, Балівіяй, а таксама Чылі — дзе жывуць «дамейкаўскія» мапучэ. Ён — стваральнік велізарнай калекцыі, якая пакуль не знаходзіць памяшкання…

Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Усе колеры дабрыні і спачування

Праграма «Літаратурная анталогія» на канале «Культура» Беларускага радыё прапануе заканчэнне рамана Георгія Марчука «Крык на хутары», з 15 лістапада — раман Фёдара Дастаеўскага «Злачынства і пакаранне» (да 200-годдзя з дня нараджэння класіка). У «Радыёбібліятэцы» гучыць фінал твора Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха», з наступнага тыдня пачнецца чытанне аповесці Людмілы Рублеўскай «Пярсцёнак апошняга імператара». Апавяданні беларускіх і замежных аўтараў чакаюць слухачоў у праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных. Сярод іх — малая проза Гілберта Кейта Чэстэртана, а таксама Ганада Чарказяна ў перакладзе Уладзіміра Марука (памяці выдатнага беларускага пісьменніка). Аматарам паэзіі праграма «Прачулым радком» прапануе вершы Уладзіміра Скарынкіна.

Змест праграмы «Радыётэатр плюс» у суботу і нядзелю складуць дзве часткі радыёверсіі спектакля «Вечар» па аднайменнай п'есе Аляксея Дударава.

Прыхільнікам дзіцячага радыётэатра канал «Культура» ў выхадныя прапануе дзве часткі пастаноўкі «Палескія рабінзоны» паводле Янкі Маўра. Чытанні для маленькіх ладзяцца па буднях у межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». Гэтымі днямі гучаць старонкі твора Паўла Місько «Эрпіды на планеце Зямля». Штовечар у 21:00 — «Вячэрняя казка» для маленькіх.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі і навінкамі беларускіх выдавецтваў, а таксама са зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

У нядзелю ўвазе слухачоў — праект Навума Гальпяровіча «Сюжэт для вечнасці». Госць эфіру радыёверсіі праграмы «Суразмоўцы», што гучыць у нядзелю і сераду, — паэт Анатоль Зэкаў.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

13 лістапада — 215 гадоў з дня нараджэння Эміліі Плятэр (1806—1831), фальклярысткі, удзельніцы паўстання 1830—1831 гг.

13 лістапада — 110 гадоў з дня нараджэння Якава Вяпрынскага (1911—1976), артыста балета.

14 лістапада — 185 гадоў з дня нараджэння Міхала Эльвіры Андрыёлі (1836—1893), жывапісца, ілюстратара, удзельніка паўстання 1863—1864 гг.

14 лістапада — 105 гадоў з дня выхаду (1916) грамадскай і літаратурнай газеты «Дзянніца», выдавалася да 13 студзеня 1917 г. у Петраградзе.

14 лістапада — 100 гадоў з дня нараджэння Фрумы (Фрыны) Лейтман (1921—1985), мастацтвазнаўца.

14 лістапада — 95 гадоў таму (1926) адбылася Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі.

15 лістапада — 100 гадоў з дня нараджэння (1921—1987) Рыгора Грамыкі, графіка.

15 лістапада — 100 гадоў з дня нараджэння Валерыя Прышчапёнка (1921—2000), спевака, заслужанага артыста БССР.

15 лістапада — 95 гадоў з дня нараджэння Ігара Краўчанкі (1926—1998), скульптара.

15 лістапада 70-гадовы юбілей адзначае Віктар Скорабагатаў, спявак, педагог, музычны дзеяч, заслужаны артыст БССР.

16 лістапада — 110 гадоў з дня нараджэння Барыса Валадарскага (1911—1987), расійскага і беларускага рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў Марыйскай АССР.

17 лістапада — 115 гадоў з дня нараджэння Янкі Багдановіча (1906—1990), празаіка, паэта, публіцыста, мемуарыста.

18 лістапада — 105 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Кухарава (1916—2000), жывапісца.

18 лістапада — 100 гадоў з дня нараджэння Ісаака Бароўскага (1921—1991), жывапісца, графіка.

18 лістапада 90-годдзе адзначае Анатоль Вярцінскі, паэт, драматург, публіцыст, крытык, перакладчык.

18 лістапада 90 гадоў спаўняецца Генадзю Мурамцаву, скульптару, педагогу.

19 лістапада 85-гадовы юбілей адзначае Эрнест Ялугін, беларускі празаік, публіцыст.

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ выказваюць шчырае спачуванне пісьменніцы Яне Явіч з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МАЦІ.

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова, Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламёдаў, Вольга Дадзіёмава, Жана Запартыка, Анатоль Казлоў, Анатоль Крэйдзіч, Віктар Кураш, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснікі галоўнага рэдактара — 319-79-85, 224-66-74
адказны сакратар — 377-99-73
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 11.11.2021 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 642

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 2853
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686